ЛіМ
ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ГАЗЕТА
ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ
БЕЛАРУСІ

26 КРАСАВІКА 1996 г. № 17 (3841) Кошт 2 500 руб.

ЧАРНОБЫЛЬ: З ВЫШЫНІ ГАДОЎ

Міхась ГРУШЭЎСКІ: "Сёння пад аховай закона аб ліквідацыі наступстваў чарнобыльскай аварыі знаходзіцца 1,9 мільёна чалавек. Застанецца недзе не больш за трыста тысяч. Будзе рэзка згорнута фінансаванне ў забруджаных раёнах сацыяльна-бытавой сферы — аховы здароўя, адукацыі, жыллёвага і культурнага будаўніцтва".

5, 12

ПАРАНЕНАЯ ДУША

Вершы з чарнобыльскага сшытка Міколы МЯТЛІЦКАГА

8

"ТРОЙЧЫ З ЗЯМЛІ СЫХОДЗІМ..."

Святлана ЛОБАЧ: "Не шукайце гэтых людзей на іх родных сядзібах, бо ў іх новы адрас. І другое, новае жыццё. Першае было да Чарнобыля..."

9, 15

ЧАРТАПАЛОХ НА ЎСКРАЙКУ ВЁСКІ

альбо Спроба чарнобыльскага вернісажу

10—11

В. Дзёмкіна. Габелен "Зорка палын".

(Матэрыял пра мастачку — на стар. 4)

ПАЧАЛАСЯ ПАДПІСКА!

Шаноўныя прыхільнікі "ЛіМа"!

20 красавіка пачалася падпіска на перыядычныя выданні Рэспублікі Беларусь на другое паўгоддзе 1996 года.

*Падпісацца на "ЛіМ" можна ў любым паштовым аддзяленні нашай краіны. Падпісны кошт на адзін месяц — **7000 рублёў**; на квартал — **21000 рублёў**; на паўгоддзе — **42000 рублёў**.*

Аформіць падпіску, калі не выпадае адразу на паўгоддзе, можна спачатку на тры месяцы, а затым працягнуць.

Над індэкс — 63856.

ЛіМ КОЛА ДЗЁН

Як бы там ні было, але мінулы тыдзень прайшоў пад знакам Чарнобыля. Гэта і зразумела, замаўчаць 10-годдзе трагічных падзей красавіка 1986 года было немагчыма. Праўда, гаварылі пра іх спачатку не ў поўны голас, а як бы нехаця, патроху-паціху згладжваючы "вострыя вуглы", наводзячы "масы" на думку, што нічога страшнага не здарылася, што тыя падзеі былі проста "увеличены политической трескотней"... І толькі за дзень да дзесятых угодкаў бяды прэзідэнт выдаў указ аб правядзенні ва ўсіх абласных цэнтрах і ў краіне ў цэлым афіцыйных мерапрыемстваў, прысвечаных трагічнай даце... Такая палітыка ўжо дала свой "плён". На сустрэчы ў Маскве лідэраў "сямёркі" вядучых дзяржаў свету, Расіі ды Украіны — Беларусі не было. Трэба думаць, "прадстаўляла" нашу краіну там супольніца — Расія. Паводле папярэдніх звестак, па выніках гэтага саміту. Украіна атрымае на ліквідацыю наступстваў чарнобыльскай катастрофы 2 мільярды долараў ад сусветнага супольніцтва. А што ж Беларусь, якая пацярпела больш за ўсіх? Беларусь — сама справіцца са "сваёй" бядой... Хто ў гэтым вінаваты? Менш за ўсё лідэры "сямёркі". Нам застаецца наракаць толькі на саміх сябе.

СУСТРЭЧЫ ТЫДНЯ

У той час, калі ў Маскве вырашаўся лёс паслячарнобыльскага свету на пасяджэннях "сямёркі" з удзелам кіраўнікоў Расіі ды Украіны, наш прэзідэнт сустракаўся з абраўшым яго народам, з чарнобыльцамі, з перасяленцамі. Паездку шырока асвятляла Беларускае тэлебачанне. З пачутага і пабачанага складвалася ўстойлівае ўражанне, што вярнуліся мы назад у 1986 год. Гэтаксама ездзіў некалі ў "зону" М. Слюнькоў, гэтаксама сустракаўся з народам А. Камай. І гучалі падобныя ж абяцанні і заспакаенні, падобныя ж пагрозы... Галоўная ж выснова з пачутага і пабачанага — ніколькі не змяніўся за 10 гадоў беларускі народ. Нічога не далі яму "дэмакратызацыя", "галоснасць" і "перабудова" ў цэлым. Як глядзеў ён з бясконцай надзеяй і бязмежнай верай у рот начальству, так і глядзіць... Вельмі хацелася б памыляцца, што гэта так, але...

ЗАКЛІКІ ТЫДНЯ

Нацыянальны камітэт па правядзенні "Чарнобыльскага шляху-96", які ўзначальвае Васіль Быкаў, паведаміў, што пачнецца "Шлях..." 26 красавіка ў Мінску а 17-й гадзіне ад Акадэміі навук і праляжа да пляца Незалежнасці, дзе і адбудзецца мітынг. Мінгарвыканкам шэсце не дазволіў, а прапанаваў арганізатарам правесці мітынг ля Палаца спорту. Альтэрнатыўны мітынг пачнецца ў парку Дружбы народаў на 30 хвілін раней. Чыноўнік з мінгарвыканкама на БТ заклікаў бацькоў прасачыць за сваімі дзецьмі і не пускаць іх на вуліцы ў гэты дзень, а студэнтаў папрасіў не паддавацца на правакацыі. Але больш за ўсіх здзівіла міністр аховы здароўя І. Драбышэўская, якая расказала, як кепска ўплывае вясновае сонца на здароўе людзей і заклікала ўсіх хворых людзей у мітынгу не ўдзельнічаць. Вядома, ніхто не тлумачыў, пра які мітынг ідзе размова: прэзідэнцкі альбо апазіцыйны. Гэта, так бы мовіць, падразумявалася само сабою...

КАМАНДЗІРОЎКА ТЫДНЯ

У Страсбург на чарговае пасяджэнне Савета Еўропы накіравалася і дэлегацыя Беларусі на чале з Ю. Малумавым. Пэўна, каб і там азнаёміць "кіраўніцтва" са зместам нікім не бачанага дагавора "Аб утварэнні ССР" (альбо — Супольніцтва) і даказаць, што ад свайго суверэнітэту, насуперак асобным пунктам дагавора, Беларусь не адмаўляецца і ў Савет Еўропы па-ранейшаму хоча ўступіць. Што ж, гэта і зразумела. Расіі, як некалі і СССР, лішні "голас" у міжнародных арганізацыях не пашкодзіць. Можа стацца так, што менавіта гэтым і закончыцца нашая "суверэннасць" у супольніцтве з Расіяй. Дык ці не таму Савет Еўропы і не спяшаецца прымаць у свой склад такую дзяржаву?

ЦЫТАТА ТЫДНЯ

"Мы ўмеем давяраць, чакаць і спадзявацца. 2 красавіка 1996 г. запушчаны механізм чарговага чакання. Слова з прэзідэнцкіх "откровений" не выкінеш. Дагавор "Аб утварэнні Супольніцтва", па версіі кіраўніка дзяржавы, павінен у бліжэйшы час запусціць заводы, ліквідаваць вынікі чарнобыльскай бяды, зрабіць спакойнымі вуліцы начных гарадоў. Дакумент падпісаны, а насельніцтва нічога рэальна атрымаць не можа. Бо колькі ні кажы "халва", у роце ад гэтага саладзей не стане, колькі не паўтарай "інтэграцыя", "саюз", жыць ад гэтага, на жаль, не лягчэй, а праблем не менш. І як звычайна, услед за чаканнямі прыйдуць расчараванні. Пытанне толькі ў тым, ці будуць яны апошнімі?"
(З артыкула народнага дэпутата ВС Беларусі Анатоля ЛЯБЕДЗЬКІ "Інтэграцыя па-візантыйску", "Свободные новости-плюс", N 16).

ЗАЯВА ТЫДНЯ

Лідэры БНФ З. Пазняк і С. Навумчык працягваюць свой растлумачальны ваяж па краінах блізкага і далёкага замежжа. МЭС Беларусі "па-свойму" адрэагаваў на гэта. Дзейнасць апазіцыйных лідэраў ён асудзіў, а краінам, якія іх прымаюць у сябе, прыгразіў ускладненнямі ў міждзяржаўных адносінах. БНФ і тут застаўся верным сабе: ён вымусіў дзяржаву Беларусь падаць "свой" голас і нагадаць, што такая яшчэ ёсць.

ЖАДАННЕ ТЫДНЯ

З Расіі паведамляюць, што быццам бы Б. Ельцын хоча канчаткова перахапіць ініцыятыву ў камуністаў. Дзеля гэтага ён гатовы ў бліжэйшы час падпісаць указ аб зацвярджэнні новага статуса былога дзяржаўнага сцяга СССР — памятаеце: чырвонага, з "хочаш жні, а хочаш куй..." уверсе. Як топішся, кажуць, дык і за лязо ўхопішся!..

ЗАБОЙСТВА ТЫДНЯ

У ноч з 21 на 22 красавіка забіты прэзідэнт Чачні Джахар Дудаеў, паведамілі расійскія СМІ. Гэтаму доўга ніхто не даваў веры. Шмат хто сумняваецца яшчэ і сёння. Падставай для таго, каб паверыць, могуць быць хіба звесткі пра тое, як загінуў "мяцежны генерал". Дж. Дудаеў павінен быў правесці перамовы з Масквой па касмічнай сувязі. Як толькі ён выйшаў у "эфір", перадатчык запеленгавалі, і на месца знаходжання Дудаева быў скіраваны ракетны ўдар...

ПАДАРУНАК ТЫДНЯ

У сувязі з 70-годдзем былога намесніка Старшыні СМ БССР Н. Сняжковай прэзідэнт Беларусі ўзнагародзіў яе каштоўным падарункам і грашовай прэміяй. Якая дзяржава — такія і ўзнагароды.

АБСУРД ТЫДНЯ

Уладам Беларусі не спадабаўся надпіс на помніку, прысвечаным пераправе французскай арміі праз Бярэзіну пад Барысавам. І помнік быў адкрыты без шыльды — голы камень, падперазаны стужкай... У Расіі, якая якраз і ваявала з Напалеонам, ёсць два помнікі ў гонар ягонай Вялікай арміі, у тым ліку і на Барадзінскім полі. У нас пра гэта, пэўна, не ведалі. І перастрахаваліся, каб не наступіць на мазоль дружбы з братнім народам.

Адгалоскі

ХАЙ БЫ ТАК БЫЛО

Інстытут Гётэ ў Мінску і Міністэрства культуры Беларусі да дзесяцігоддзя чарнобыльскай трагедыі здзейснілі сумесны тэатральны праект — тэатралізаванае прадстаўленне "Помні". Ідэя належыць дырэктару Мінскага Гётэ-Цэнтра Веры Багальянц. Аўтары і рэжысёры-пастаноўшчыкі Ангеліка Штаўт (Германія) і Валянціна Еранькова (Беларусь). Выканаўцы — артысты Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра, Дзяржаўнага тэатра лялек, а таксама вучні мінскіх школ, якія пасля чарнобыльскай катастрофы наведалі Германію з мэтай аздараўлення. Спектакль уяўляе сабою аповед пра гэтую вандроўку, пра жыццё беларускіх дзяцей у нямецкіх сем'ях. Прэм'ера адбылася на сцэне Маладзёжнага тэатра 24 красавіка.

Падлеткі іграліі саміх сябе і пад уласнымі імёнамі. Я назваў бы гэта інсцэніроўкай школьнага сачынення на тэму "Як я правёў канікулы ў Германіі". Паслядоўнасць падзей у спектаклі такая: выбух Чарнобыльскай АЭС; дзеці становяцца ахвярамі трагедыі, сведкамі і ўдзельнікамі падзей, што разгортваюцца ў "зоне" пасля выбуху; дзецям пашчасціла пакінуць зону (хоць увогуле дзяржаўная праграма перасялення бяздарна правалена) — цяпер усе яны мінчукі; яны разам наведваюць Германію і цяпер іх збліжае не толькі агульная бяда, але і ўспаміны пра "краіну цудаў". Клопат аб малалетніх ахвярах Чарнобыля збліжае і дарослых, збліжае Беларусь і Германію. Такі прыблізна змест...

Я не стаў бы ацэньваць гэту акцыю з прафесійных пазіцый (я не тэатральны крытык, а на сцэне ў асноўным іграліі непрафесійныя акцёры), але чыста па-чалавечы ўбачанае кранае.

Свет пасля Чарнобыля павінен стаць светам любові. Любоў уратуе свет, нібыта гавораць стваральнікі спектакля.

Мне гэты тэзіс падаецца даволі спрэчным. Але калі б спектакль справакаваў дыскусію аб шляхах выратавання чалавека і чалавецтва, хай бы ў ёй перамагла думка стваральнікаў спектакля "Помні". Хай бы так было...

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Выставы

"ПЕРАХОПЛІВАЕ ДЫХАННЕ..."

Такімі словамі выказаў сваё ўражанне ад выставы Анатоля Клешчука галоўны рэдактар "Звязды" І. Наркевіч. Экспазіцыя, адкрытая ў Нацыянальным музеі РБ, гэта не толькі дакументальны, але і мастацкі летапіс чарнобыльскай навалы. Вядомы нам фотамайстра пяць гадоў не выпускаў з-пад увагі "зону бяды" і па-свойму расказаў людзям праўду пра тое, што ёсць для нас Чарнобыль. "Мне здаецца, што гэта мае дзеці", — так сказаў сам А. Кляшчук пра малых, чые зусім недзіцяныя вочы глядзяць на нас з яго балючых фотадакументаў.

На адкрыцці выставы слова бралі народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч, міністр па надзвычайных сітуацыях І. Кенік, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і Міністэрства аховы здароўя, госці з Германіі. Прафесар мастацтвазнаўства М. Рамнюк, адышоўшы ад тэматыкі выставы, гаварыў пра высокую мастацкую якасць фотаработ А. Клешчука, пра тое, што фатаграфію як від мастацтва ў нас яшчэ па сутнасці не адкрылі.

На заканчэнне лаўрэат многіх міжнародных прэмій (а яго здымкі шырока выстаўляліся ў краінах Еўропы) А. Кляшчук выказаў падзяку Беларускаму фонду Сораса, калектыву газеты "Звязда", Дзяржкамдруку і Нацыянальнаму музею — усім, хто дапамог яму ў арганізацыі гэтай выставы і выданні каталога.

Г. З.

ЧАРНОБЫЛЬ — ГАДЫ І ЛЁСЫ

У сталіцы нашай дзяржавы Мінску праходзіць тэматычны паказ фільмаў, прысвечаных 10-годдзю самай страшнай у гісторыі чалавецтва катастрофы. Гонар адкрыць яго выпаў кінабаладзе "Метанойя", створанай на студыі "Профі-С" Беларускага саюза кінематаграфістаў. Аўтары сцэнарыя Я. Рутман і В. Шувагін, ён жа і рэжысёр фільма. Галоўныя ролі выконваюць народная артыстка СССР С. Станюта і С. Марозаў.

Тыя, хто сабраўся ў Рэспубліканскім Доме ветэранаў, змаглі далучыцца да складаных лёсаў людзей, якія вымушаны рабіць падрахункаванне свайму жыццю. Дарэчы, адзін з грамадскіх праглядаў гэтай стужкі 17 красавіка праходзіў у Доме літаратара і выклікаў вялікую цікавасць гледачоў. Думаецца, змест "Метанойі" дакладна перадала надзвычай ёмкая анатацыя, што была змешчана тады на запрашальных білетах: "Кінабалада. Гукавыя і зрокавыя асацыяцыі закладзены вершамі Іосіфа Бродскага, пакладзенымі на музыку. Жыццё — шлях да кахання, гібель кахання — шлях да смерці. Ён і Яна. Мастак і журналістка, Чарнобыльская зона. Героі фільма, пакінутыя Богам, знаходзяцца ў стане страчанага кахання. Кожны з іх праігрывае магчымую псіхалагічную мадэль паводзін. Выратаванне прыходзіць праз пакаянне, праз адмаўленне ад свайго Я. Зварот да сімволікі хрысціянства — лагічнае завяршэнне кінасюжэта".

Сёння ж у Доме ветэранаў можна пазнаёміцца з тэлефільмам "Выгнаннік" і работай украінскіх кінадакументалістаў "Чарнобыль — гады і лёсы". Увогуле, у сталічных кінатэатрах паказваюцца шмат якія работы тых, хто паспяшаўся сказаць праўду пра Чарнобыль і яго наступствы. Дэманструюцца такія дакументальныя фільмы, як "Мужнасць і гераізм пажарных Чарнобыля", "Зона", "Чарнобыль. Хроніка цяжкіх тыдняў" і іншыя.

У Дзень чарнобыльскай катастрофы ў кінатэатры "Піянер" паказваецца мастацкі фільм "Чорны бусел" — плён творчай садружнасці рэжысёра В. Турава і сцэнарыста Ф. Конева.

Н. К.

ДНІ ВЫДАВЕЦТВАЎ

Як мы паведамлялі, у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі была арганізавана выстаўка "Беларуская кніга-95", на якой прадстаўлены кнігі, брашуры, выпушчаныя як дзяржаўнымі, так і недзяржаўнымі выдавецтвамі ў 1995 годзе. У рамках гэтай выстаўкі прайшло шэраг мерапрыемстваў, накіраваных на прапаганду беларускай кнігі. Адбыліся на выстаўцы і дні вядучых дзяржаўных выдавецтваў "Мастацкая літаратура" і "Юнацтва".

Выступаючы перад прысутнымі, дырэктар выдавецтва "Мастацкая літаратура" С. Андраюк адзначыў, што летась з маркай "МЛ" пабачылі свет 92 назвы кніг. Безумоўна, гэта ў параўнанні з іншымі гадамі — няшмат. Тым не менш "Мастацкая літаратура" робіць усё магчымае і немагчымае, каб беларуская кніга жыла. Апошнім часам у выдавецтве ўдзяляюць вялікую ўвагу аўтарам, якія жывуць на перыферыі. Пацвярджэнне таму і выпуск кнігі паэзіі Т. Ляшонка з Глыбокага.

"ЛіМ" у свой час пісаў пра гэтага таленавітага аўтара, кніга якога "Запознены дар" і на самай справе стала паэтычным дарам. Фама Васільевіч разам з выдавецкімі работнікамі завітаў на гэтую сустрэчу. Цёпла гаварыў пра паэта народны пісьменнік Беларусі І. Шамякін. Яго творчасць, падкрэсліў Іван Пятровіч, падарунак кожнаму, хто любіць сапраўдную паэзію. Мяне ж асабіста, працягваў ён, творчасць Т. Ляшонка проста зачаравала. Я ўвогуле люблю паэзію традыцыйную, а тут такая блізкасць да народных вытокаў.

"Запознены дар", сказаў рэдактар кнігі паэт М. Мятліцкі, сапраўды дар, якому нельга не радавацца. Адна з прыкметных якасцяў паэзіі Фамы Васільевіча — яе напеўнасць, мілагучнасць, песеннасць.

Дарэчы, праз некаторы час удзельнікі сустрэчы змаглі ў гэтым добра пераканацца. Самадзейныя артысты з Глыбокага выканалі некалькі песень на словы Т. Ляшонка, напісаных магілёўскім кампазітарам М. Яцковым. Колькі сваіх твораў — плён сумеснай творчасці з Фамой Васільевічам — праспяваў і сам М. Яцкоў.

А. М.

●

Зацікаўленая размова аб выніках работы ў мінулым годзе, аб праблемах і творчых поспехах, планах і перспектывах ішла на сустрэчы з чытачамі і супрацоўнікамі бібліятэкі творчага калектыву выдавецтва "Юнацтва". Перад прысутнымі выступілі дырэктар выдавецтва В. Лукша і галоўны рэдактар М. Пазнякоў. Рэдактар У. Карызна і мастак-ілюстратар С. Волкаў расказалі аб гісторыі і выпуску ўнікальнай кнігі "Казкі дзяцей Беларусі".

Другая частка сустрэчы прайшла пад дэвізам "На крылах музыкі і песні". Прагучалі ўжо вядомыя і новыя песні У. Карызны ў выкананні вакальнага дуэта ў складзе Н. Раманскай і В. Шыкаўца, а таксама песні на словы С. Панізніка ў выкананні кампазітара Г. Казловай.

М. КУЗЬМІЧ

Фота А. МАЦЮША

"ЧЫРВОНАЙ ЗМЕНЕ" — 75

Здавалася б, узрост старэйшай беларускай маладзёжнай газеты зусім не ...маладзёжны, тым не менш "Чырвонка", як яе называе ўжо не адно пакаленне чытачоў, па-ранейшаму застаецца маладой і юнай. А менавіта таму, карыстаецца такой вялікай папулярнасцю і ў сучасных юнакоў і дзяўчат. Пацвярджэнне таму — павелічэнне апошнім часам тыражу газеты, які пераваліў ужо за 70 тысяч экземпляраў.

У сувязі з юбілеем "Чырвоную змену" павіншавалі кіраўнікі Рэспублікі Беларусь, шматлікія яе чытачы. А наколькі яна застаецца сваёй газетай для многіх і многіх, можна пераканацца, пазнаёміўшыся з яе святочным нумарам, што выйшаў здвоеным аб'ёмам у мінулую суботу.

А яшчэ ёсць мажлівасць вярнуцца ў гады ваенныя, завітаўшы ў Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У ім, як вядома, працуе пастаянная экспазіцыя "Партызанскі друк у час вайны". Цяпер, у сувязі з юбілеем "Чырвонкі", яна пашырана. У дзвюх спецыяльна афармленых вітрынах размешчаны матэрыялы, што дапамагаюць даведацца, як жыла газета ў гады ўсенароднага змагання з фашызмам. Гэта друкарскія прылады, без якіх выхад газеты быў бы немагчымы, і здымкі, дакументы тых, хто ствараў газету ў вайну, асобныя нумары, што даўно сталі сапраўды "музейнымі".

СЛЫННАМУ АСВЕТНІКУ

Помнік Кірылу Тураўскаму напярэдадні Вялікадня ўстаноўлены ў вестыбюлі галоўнага ўваходу Мінскай праваслаўнай епархіі. Каб увасобіць воблік аднаго з тых, хто дбаў пра асветніцтва народа, паклапаціўся скульптар Ю. Платонаў. Ініцыятарам стварэння помніка Кірылу Тураўскаму выступіў старшыня мінскага асветніцкага клуба "Спадчына" А. Белы. У перспектыве згаданы помнік "пераедзе" і будзе стаяць каля будынка Духоўнай акадэміі, якая, як вядома, носіць імя Кірылы Тураўскага.

У РЭДАКЦЫЮ "ЛІМА"

Дазвольце праз вашу газету перадаць нізкі паклон усім, хто павіншаваў з юбілеем, што стала для мяне яшчэ адной прыступкай да людской глыбіні і сардэчнасці.

Раман ТАРМОЛА-МІРСКІ

Надзённае

О РАДЗІМА, ПТУШКА МАЯ БЕЛАЯ!

Яшчэ нядаўна я ганарылася тым, што стварыла свой асабісты свет, што жыву ў сваёй віртуальнай рэальнасці, пішу пра каханне, вернасць і дабрыню і іншага для мяне не існуе. Але зачыніцца ад жывога жыцця — нельга. Яно прыходзіць само, яно палоніць, яно ўкручвае у свае віры, бо кожны з нас кропля таго акіяна, што завецца грамадствам. І нельга абмінуць тых праблем, тых трывог, сумненняў і спадзяванняў, якімі жывуць сёння людзі. Тое, што адбываецца з імі — адбываецца і са мною. Іх клопат — мой клопат. Іх думы — мае думы. Вось таму і нараджаюцца менавіта такія радкі.

●

Туман апавіў мае ногі,
і сцежкі зусім не відно,
як у моры, — няма дарогі
і глыбока-глыбока дно.
Ступаю. І кожны крок мой —
рызыка. Сіл не стае.
Галінку алешына крохкая,
нібы руку падае.
За той паратунак схапліюся,
падзякую за падмогу.
...Туман над усёй Беларуссю —
не адна я згубіла дарогу.
Блукаем сляпцамі ў тумане,
тумане бязвер'я, бядоты, хлусні.
Дарогі шукаем...
Ды толькі вось памяць —
стары і падраны браднік —
на чужыя выводзіць агні.
А сонца рассыпле промні,
ды не рассее сумненняў
і стомы, —
бо гэтак блукаць нам,
пакуль не успомнім
і з болем не усвядомім:
Дзе мы? Навошта? І хто мы?!

●

Вясна. Ды мароз яшчэ цісне.
Не хоча зіма адступаць.
Не знайшлі мы адвечных ісцін.
Ды й дзе іх зараз шукаць.
Скінуты з воч ужо чары,
І мроі туманам сплылі...
Мясцовыя янычары
Новы рэй павялі.
Не раіліся і не пыталі
(Да здзеку народ прывык).
...У полі няма праталін,
Хоць ужо й красавік.
А можа, знарок марудзіць:
Як цяжка сказаць "люблю".
Не лягчэй,
чым тутэйшым людзям
Ачужэлую песціць зямлю.

●

Песню пачала... І не дапела я.
Горла мне ад слёз перацяло...
О Радзіма, птушка мая белая,
Няўжо ты зноў патрапіла ў сіло?
Янычары, якім мы даверліва
Пакідалі ад нябёс ключы,
Даўно табе кайданікі прымервалі,
Меркавалі: заманіць бы чым.
Каб засіліць тваю песню шчырую,
Голас твой нялюб ім і нямілі.
Верыцца ж,
што вернешся ты з "выраю"
На сцягах,
як роспраст белых крыл.

●

Чуеш паўсюдна: "так ім і нада,
Хай маўчаць, хай трываюць яны!"
Затапіла паводкаю здрада...
Ды няма тут народа віны —
Яму чуецца шчэ кананада
З той пякельнай вялікай вайны.
І не трэба народ пацвельваць...
Як прыціхла, знямела зямля!
Дзе знайсці ёй гаючае зелле,
Адагнаць той задаўнены страх?
Нібы шнар на знявечаным целе,
Лёг пякучы чарнобыльскі шлях.

●

Халодныя вочы і сцятыя вусны.
Па вуліцы йдзеш, як праз строй,
О людзі, успомніце,
мы ж — беларусы,
Павінны адзін за другога гарой.
А гэтак зняверaны і раз'яднаны,
На розных мы мовах гаворым.
Якім жа, скажыце, падманам
Нас разлучылі? Якім нагаворам?
Не хачу я вачэй атухлых,
Не хачу я няшчырага слова!
Сярод вас, ад прамоў аглухлых,
Ці пачуе мае хто замовы?
Ціха вецер лістоту варушыць,
Ці то губы штось шэпчуць?
Няўжо
Нам самоту і горыч не зрушыць,
Не падняць абавялых душой?!
Знайце, няма такіх болей
на свеце,
Мы адны на планеце ўсёй!
Беларусы —
прыроды гаротныя дзеці,
Дык куды ж мы свой крыж нясём?

Ніна МАЕЎСКАЯ

У ПАМЯЦЬ ЛАРЫСЫ ГЕНІЮШ

**Верны будзь слову,
якім Купала,
прарок народны,
сэрцы ўзварушыў.**

**Верны будзь слову,
якое ўпала
з матчыных вуснаў,
як з неба, ў душу.**

Гэтыя радкі Ларысы Геніюш сталіся лейтматывам вечарыны ў памяць паэткі, якая 5 красавіка пачалася выступамі пісьменнікаў, тых, хто добра ведаў Ларысу Антонаўну, у літаратурным музеі Янкі Купалы і закончылася памінальнай вячэрай ва ўтульнай кавярні "У Янкі".

Успамінамі пра незабыўную Ларысу Геніюш, развагамі пра яе творчасць з прысутнымі падзяліліся Янка Брыль, Адам Мальдзіс, Вячаслаў Рагойша, Міхась Чарняўскі, Алесь Траяноўскі, Уладзімір Ягоўдзік, Уладзімір Мазго, Сяргей Панізнік (які таксама дапамог наладзіць фотавыставу).

Геніюшаўскае слова хораша гучала ў выкананні Віктара Манаева, Галіны Кухальскай, Алеся Камоцкага, Алега Атаманава. Як заўсёды, натхнёна і пранікліва вяла вечарыну Антаніна Хатэнка.

Сваё зямляцкае слова пра вялікую паэтку сказаў і дырэктар гарадзенскай фірмы "Альгерд" Валянцін Дубатоўка — фундатар факсімільнага выдання кнігі Ларысы Геніюш "Ад родных ніў", якую можна было набыць на вечарыне.

Я. ЗЭЛЬВІЧ

Фота В. САВІЧА.

Паэтку прыгадвае Міхась Чарняўскі.

НАРОД, ЛЁС, БУДУЧЫНЯ

АДКРЫТЫ ЛІСТ УРАДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

10 гадоў народ Беларусі з'яўляецца заложнікам экалагічнага бруду. Ніякіх матэрыяльных сродкаў нашых людзей не хопіць, каб адолець гэтую бяду. На жаль, ні наш айчынны ўрад, ні ўрады Расіі і Украіны не спяшаюцца, а, можа, і не ў стане дапамагчы нам.

У рэспубліцы менш за 10 працэнтаў здаровых дзяцей, зніжаны імунітэт, пашыраюцца хваробы ў дарослага насельніцтва, скарачаецца яго век. Ужо некалькі гадоў выразна фіксуецца выміранне народа і нацыі.

Беларуская экалагічная партыя заклікае урад Рэспублікі Беларусь тэрмінова звярнуцца ў Міжнародны суд у Гаазе за юрыдычным азначэннем вінаватых, за падлікам страт і магчымасцю матэрыяльнай кампенсацыі з боку асобных дзяржаў і сусветнай супольнасці. Глабальную экалагічную катастрофу можна адолець толькі разам, розумам усяго Чалавецтва. І ніякія адначасныя палітычныя або эканамічныя выгады, якія бачыць у сваёй бяздзейнасці урад, не здольны засланіць той факт, што нам давядзецца яшчэ не адно дзесяцігоддзе траціць на Чарнобыль вялікія сродкі.

Калі ж мы не звернемся ў Міжнародны суд, то страцім павагу да сябе ў суверэнных дзяржаў, якія неўзабаве забудуць і на Чарнобыль, і на нашу нацыянальную бяду, што зводзіць народ на нішто.

Перад тварам гэтай небяспекі мы заклікаем урад прыкласці ўсе намаганні, каб спыніць эксперымент над народам, які доўжыцца ўжо 10 гадоў. Улады сёння не маюць права на памылкі. А палітычныя партыі — на пустыя часам спрэчкі і разлады паміж сабой. Сёння ўсё павінна быць скіравана на грамадзянскае паразуменне і падтрымку народа, на стварэнне ўмоў для яго аднаўлення, адраджэння фізічных і духоўных сіл.

Заклікаем усе партыі, грамадскія рухі і аб'яднанні падтрымаць нашу заяву і пакласці клопаты пра народ, яго лёс, яго будучыню ў аснову ўсёй сваёй дзейнасці.

Цэнтральны Савет Беларускай экалагічнай партыі

Варункі

НАШЫЯ СВЯТЫ

Памятаю, як з-пад палкі ганялі нас у школе на дэманстрацыі. Паспрабуй не прыйдзі. У заводскіх калонах людзі самі імкнуліся неяк развесяліцца. Перад выхадам "бралі" па ето, заўсёды знаходзіўся гарманіст, і тады можна было прайсціся, паспяваць.

Тады ж любілі фатаграфавацца. Захавалася ў мяне картка з Карэліі з дзедам Усцінам у калоне. Над калонай — партрэты Берыі і Мікаяна. На другой, ужо светлагорскай картцы, бацька трымае лозунг "Дружба народов", а побач стаіць такі ж самы слесар і трымае лозунг "Свобода".

Мы ў школе пасля першамайскай дэманстрацыі заўсёды адкрывалі купальны сезон. Так было.

Затым, пасля развалу камуністычнай дыктатуры, зняли іхняе свята перавароту — 7 лістапада, затое сталі дзяржаўнымі агульнахрысціянскія святы — Каляды і Вялікдзень, а таксама нашыя нацыянальныя — Радаўніца і Дзяды.

За апошніх пару гадоў пасля прэзідэнцкіх выбараў камуністы пачалі наступаць і зноў закрываніў над Беларуссю чырвоны Кастрычнік. Апошнім разам гэта зноў-такі быў выхадны дзень, але на душы было неяк трывожна.

Абыякава людзі ўспрынялі новы выхадны — Дзень Канстытуцыі. З аднаго боку, яшчэ не звыклися з сапраўды сваёй Канстытуцыяй, з другога — апошнім часам "наязджае" на яе прэзідэнт. Адпаведна, пра гэтае свята маўчаць, як у рот вады набраўшы, афіцыйныя сродкі масавай інфармацыі.

Яшчэ больш складаная сітуацыя з ліпеньскім Днём незалежнасці...

Пайшлі чуткі, што 2 красавіка мы будзем "святкаваць" Дзень супольнасці. Затое абяцаюць скасаваць каталіцкія святы, канчаткова перавёўшы час агульнахрысціянскіх святаў на маскоўскую паралель. А там, як вядома, усё не так, як у свеце, там нават Хрыстос нарадзіўся на два тыдні пазней. Адным словам, ясных крытэрыяў у нас няма.

Што рабіць? Выйсце, мне здаецца, простае. Паглядзець — а што ж святкуюць іншыя нацыі.

Мяркую, з агульных з іншымі дзяржавамі святаў варта пакінуць толькі хрысціянскія.

Што тычыцца міжнароднага Дня працоўных — 1 мая, за які так узмоцнена цягнуць камуністы ды сацыял-дэмакраты, дык, упэўнены, што гэта элементарны папулізм, які сыходзіць з іхніх тэзісаў пра рабочых як рухаючую сілу прагрэсу і г.д. У 1943 годзе на 1 мая Вільгельм Кубэ, дайце веры, павучаў беларускі народ: "Сацыялізм — гэта праца... У гэты дзень кожны працоўны павінен радавацца, бо гэты дзень з'яўляецца днём шанавання працы й працоўнага". Пры немцах гэта было дазволенае свята для "рабочай скаціны". Тое ж раблі і камуністы.

8 красавіка — міжнародны жаночы дзень, які, як кажуць, прыдумала Клара Цэткін. Не ведаю, можа, хто падкажа, якія адносіны яна мела да беларускіх жанчын?

Не. Нам патрэбныя свае святы: Дзень незалежнасці, Дзень беларускай вайсковай славы, Дзень беларускай канстытуцыі, Дзень беларускай жанчыны, Купалле — Дзень народнага свята, 9 мая — Дзень барацьбы з фашызмам у любых яго праявах, урэшце, як дзяржаўнае ўсеагульнае свята — Дзень беларускай культуры і друку. Штосьці будзем святкаваць ужо цяпер, а штосьці пакінем на потым. Урэшце так ужо зроблена ва ўсім цывілізаваным свеце.

Алесь БЯЛЯЦКІ

"ГЛЯНУЎШЫ Ў ВОЧЫ БЯДЫ..."

Ад мажорнай бравурнай музыкі — святочна; што ні твар — тое ўсмешка; зала распаляецца ад воплескаў... Так звычайна бывае на канцэртах Мінскага духавога аркестра "Нямігa". На гэты ж раз было іначай. Дата "26 красавіка" кінула свой сумны цень нават на фестываль, сутнасць якога — свята. На афішы сёлетняй "Мінскай вясны", якая ладзілася пад дэвізам "Музыка на мяжы XXI стагоддзя" і сталася своеасаблівым мастком у такі блізкі ўжо новы век, з'явіўся канцэрт, пазначаны, нібыта чорнай жалобнаю стужкай, зусім не святочным радком: "10-годдзю чарнобыльскай трагедыі прысвячаецца". Гэта быў канцэрт "Нямігі"...

Публіка не падтрымлівала воплескамі кожны нумар праграмы: апладысменты былі толькі перад антрактам ды на заканчэнне вечара. Насуперак традыцыям, папулярны калектыў, улюбёнец слухачоў, не граў на "біс", хаця дырыжора колькі разоў выклікалі на паклон...

За пультам быў у гэты вечар маэстра Пётр Вандзілоўскі, амаль поруч з якім спраўляў свой нават не чытальніцкі, дый не акцёрскі — спавядальна-апавядальніцкі чын артыст Валеры Анісенка. Між музычных твораў гучаў яго пранікнёны голас: ён чытаў паэму Сяргея Законнікава — для большасці ў зале пакуль незнаёмую, але такую "сваю", блізкую болем перажыванняў, думак, высноў, — усім ладам чарнобыльскага рэха. Яркі, глыбокі, хвалюючы гукавы вобраз праграмы (творы І. С. Баха, Р. Вагнера, Я. Глебава, Л. Мурашкі, С. Пракоф'ева...) нібыта заклікаў мацаваць дух, мець мужнасць і мудрасць, дабрыню ў сэрцы і святло ў душы, каб жыць. Нам трэба жыць!

Нам трэба жыць! Жыць — засвойваючы трагічныя ўрокі лёсу і не губляючы людскасці. Не губляючы Боскага — у душы чалавечай. Ці не з гэткімі думкамі ладзяць свой "Чарнобыльскі шлях", скіроўваючы творчыя маршруты ў асабліва пацярпелыя раёны, Ігар Лучанок, Уладзімір Буднік, Ядзя Паплаўская ды Аляксандр Ціхановіч, Акадэмічны хор пад кіраўніцтвам Міхася Дрынеўскага і малады Мінскі абласны камерны хор "Санорус" на чале з Аляксеем Шутам? Ці не з гэткімі думкамі стварылі свае кампазіцыі, "героямі" якіх рабіліся цэзій-137 ды стронцый-90, Вячаслаў Кузняцоў, Сяргей Бельцюкоў? "Пейзаж" з яго постчарнобыльскімі алюзіямі — Алега Залётнева, "Уяўленне і плач аб пакінутай вёсцы" — Уладзіміра Дарохіна, строгая, як дакумент, песня Валянціны Сярых на верш Эдзі Агняцвет пра невылечна хворага хлопчыка...

Можна ўспомніць нямала прозвішчаў тых, хто адкрытым сэрцам рэагуе на боль чарнобыльцаў: ладзіць канцэрты і дабрачынныя творчыя акцыі, складае песні, піша інструментальныя кампазіцыі... Па вялікім рахунку, усе мы — дзеці Чарнобыля, і калі сёння пакуль не ахвяры, дык пэўна — заложнікі яго. Але нават самыя безабаронныя з нас — хваравітыя малалеткі ці "практычна здаровыя" насельнікі экалагічна небяспечных мясцін — спавядаюць радасць жыцця і творчасці, ладзяць фэсты і агледзіны свайго мастацтва. Яны не страцілі здольнасць захапляцца і ўсмешкай сваёй дзяліцца з людзьмі, сцвярджаючы касмічную ісціну: жыццё не спыняецца!

"Успомніш пра Бога, глянуўшы ў вочы бяды..." — прагучала, узмоцненае шматгалосым эмацыянальным атачэннем аркестравых галасоў, паэтава слова. Успомніш... І адчуеш вялікую адказнасць за вялікі дар Бога — жыццё. Трэба зберагчы яго. Трэба жыць!

С. БЕРАСЦЕНЬ

У БЕЛАРУСАЎ САНКТ-ПЕЦЯРБУРГА

Беларускае грамадска-культурнае таварыства ў Санкт-Пецярбурзе правяло ў сакавіку два пасяджэнні. На іх былі заслуханы даклады старшыні рады таварыства пра Т. Касцюшку (да 250-х угодкаў з дня яго нараджэння (у рамках праграмы года Касцюшкі) і 78-х угодкаў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі.

ЗАПРАШАЕМ НА КАНФЕРЭНЦЫЮ

У пачатку чэрвеня 1996 г. у г. Мёры праводзіцца першая навукова-практычная канферэнцыя "Дзісненскія чытанні". Запрашаем прыняць удзел навукоўцаў і краязнаўцаў, якія маюць матэрыял па гісторыі Дзісненшчыны.

Тэзісы канферэнцыі будуць надрукаваны.

З прапановай звяртацца па адрасе:

Віцебская вобл. г. Мёры, вул. Школьная, 16, Раённы музей. Тэлефон 2-19-15

Дзесяць гадоў прайшло з часу чарнобыльскай катастрофы. Для Беларусі гэтая трагедыя стала нацыянальным бедствам. Выдадзена нямала прац на гэту тэму. Выйшла ў свет і кніга "Чарнобыль" (выдавецтва "Беларуская энцыклапедыя"), дзе ёсць раздзел, прысвечаны тэме Чарнобыля ў выяўленчым мастацтве. Мастакі аднымі з першых звярнуліся да гэтай тэмы, ездзілі ў закрытую зону, рабілі натурныя замалёўкі, эцюды, накіды, удзельнічалі ў выставах. Сярод іх — выдатны майстар габелена Вольга ДЗЁМКІНА.

Вольга Дзёмкіна.

ЗОРКА ПАЛЫН

Згадаем яе работы — "Чорная быліна" (1989), "Крыніца часу" (1989), "Зорка палын" (1991). Спалучэнні чырвоных, чорных, белых колераў надае творам трагізм. Работа "Чорная быліна" мае і іншую назву — "Аб ненароджаных дзецях Палесся". "Габелен быў прысвечаны сястры, якая стала ахвярай чарнобыльскай трагедыі, — тлумачыць мастачка, — задуманы ў трохколернай гаме старажытных народных беларускіх колераў. Белы — сімвал святла, святасці, чысціні, адлучанасці ад зямнога, скіраванасці да нябеснага. Чырвоны — цяжкі, гарачы, кідкі, колер жыцця і адначасова барацьбы".

На габелене — жанчыны ў смутку, бо змушаны пазбавіцца плода, які выношвалі з любоўю. Напоўнены жалем вочы мацярок. Гэта — маці зямлі беларускай, апалены Чарнобылем. Чорны колер на палатне пададзены ў выглядзе чарта-палоха, ён азначае падземнае святло. Зоркі — гэта космас, а верхняе Божае святло і ніжэйшы ярус замыкаецца выявамі жанчын з цярновымі вянкамі на галовах. Колас, што мог стацца сімвалам надзеі, звіс долу.

У габелене сімвалічна ўсё — і сам фон, на якім праступаюць язычкі полымя, і колер чырвоных мафорый, што сцякае, як кроў, на арнаментальную кайму сарочкі. Драматызм падкрэслівае чорны мафорый у руках жанчын і серп у адной з іх. І толькі тры цэнтральныя фігуры трымаюць колас, як свечку, з надзеяй захаваць немаўлятка. Тут, у цэнтры габелена, сумяшчаюцца ўсе тры колеры, але асноўным застаецца чорны. І толькі зоркі на чорным аксаміце высвечваюць чысціню — але нежывога свету.

Зоркі, полымя, вада, святло ў ранніх творах В. Дзёмкінай, як у традыцыйным народным мастацтве, былі добрымі знакамі. Чарнобыль змяніў гуманную сутнасць многіх сімвалаў, як змяніў каларыт і колеры нашай зямлі. На апошніх габеленах мастачкі ўладараць новыя фарбы — трывожны жоўты, чорны, з чырвоным водбліскам бяды.

"Зорка палын" (1993) — габелен-плач. Вароты чорнага колеру нібы падзяляюць палатно на дзве часткі. Узнесліся ўверх, у неба, крумкачы. Чысцюткая, яркая зорка абпальвае іх крылы. А на першым плане ўзнімаецца полымя, яно спальвае ўсё жывое і дакранаецца да алтара з выявамі Адзігітрыі Палескай з немаўлятам на руках і Міколы Цудатворнага, на якія зверху слязьмі капае смала.

Зорка — асноўны сімвал амаль кожнай работы В. Дзёмкінай. І калі ў чарнобыльскіх габеленах ён — трывожны, то ў цыкле "Пакланенне зоркам" (1992) ён па-сапраўднаму містычны, звязаны з космасам, чалавекам, дрэвамі, вадою, зямлёю.

"Лепш за ўсё мне працуецца ўначы, калі ўсё спіць. Не чуваць грукату машын, таропкіх крокаў людзей, — распавядае мастачка. — Магічны дыялог адбываецца найперш летам, у купальскую ноч, калі зорка, якая падае зверху, нагадвае мне маё дзяцінства і гульню са светлячкамі. У рабоце "Пакланенне зоркам" я згадваю паданне пра нашы душы (шатэмы). Увесь свет — адно вялікае дрэва, дзе ствол — тулава, карані — ногі, галінкі — рукі. Уначы, зімою скінутае лісце шчыра вядзе дыялог з зоркамі. Зоркі дакранаюцца да сярэбраных галінак, а тыя, заледзянелыя, пазвоньваюць. З дзяцінства хацелася ўзяць іх у рот і паспытаць на смак..."

У рабоце "Панадпрыпяцкая завіруха" (1992) я звяртаюся да экалагічнай тэмы, чысціні маёй зямлі, да экалогіі душ чалавечых. Я адмаўляюся ад зямных колераў і цёплай гамы. Вялікая белая птушка крыламі па дыяганалі падзяляе кампазіцыю на дзве часткі: касмічную і зямную. На зямной частцы — маленькія вёсачкі, храмы са званамі. Снежныя віхуры нібы адчуваюць завыванні ветру, і гэтая мелодыя — мелодыя суму і смутку".

Праз колер (ізумрудны, белы, срэбраны) мастачка паказвае дынаміку дыхання зямлі, прыроды ў зімовай завірусе. Белая птушка — гэта наш народ, які духоўна не загінуў.

Белы колер В. Дзёмкінай мае безліч адценняў, бо самавыяўленне мастачкі ідзе ў суладдзі з навакольнай прыродай. Лёгкія дынамічныя мазкі кладуцца ў імклівым рытме, размытыя контуры вобразаў няяркія, але эмацыянальна напоўненая палітра надае творам магічна-сімвалічны сэнс.

Вольга скончыла Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Беларускую акадэмію мастацтваў), пасля аспірантуру. Часта ездзіла ў экспедыцыі па Беларусі, збірала, вывучала творы мастацтва: ручнікі, посцілкі. Унікальныя народныя рэчы здымала на слайды, фотаздымкі. Многія сабраныя ёю творы зберагаюцца цяпер у музеях Беларусі. Ад таго часу засталося шмат мастацтвазнаўчых работ, у якіх яна спрабавала разгадаць таямніцы народных арнаментаў, а пасля выкарыстоўвала іх у сваіх работах. Узоры народнага мастацтва, на яе думку, павінны для кожнага заставацца камертонам творчасці, дарогаю да чысціні і святла.

Габелен мяне вабіў даўно, бо ў ім можна рэалізаваць усе свае задумы, падборам таноў можна перадаць атмасферу, глыбіню прасторы, адценні настрою, думак. Падсвядома я даўно адчувала сваю прыроджаную сувязь з даўняй традыцыяй знакамітых карэліцкіх шпалераў і старалася не стылізаваць, а пераасэнсоўваць спадчыну. На жаль, сёння такі час, што няма зацікаўленасці ў габелене. Ніхто не заказвае, ніхто і не купляе. Барысаўскі камбінат не працуе. Пішу эскізы, карціны, хоць бачу ўсё толькі праз ткацтва. Бог дасць, мо прыйдзе час, калі маё мастацтва спатрэбіцца людзям...

Творы Вольгі Дзёмкінай пазнаеш адразу. Яны вылучаюцца сваёй шчырасцю, вытанчанасцю, узнёсласцю і загадкавасцю. На яе творчасць не ўплывае мода і палітыка. Яна распрацоўвае, вывучае і дапаўняе тую ж тэму, якой захапілася яшчэ ў студэнцкія гады. Пра яе творы можна пісаць і гаварыць шмат, але толькі ўбачыўшы іх, можна адчуць думкі самой мастачкі, яе багацейшы ўнутраны свет, яе шчырую любоў да радзімы і людзей, дзеля якіх яна працуе.

Габелен "Крыніца часу".

Галіна ФАТЫХАВА

Габелен "Чорная быліна".

Уладзімір ВЕРАМЕЙЧЫК

ЛІХАЎНЯ

РАЗДЗЕЛ З ПАЭМЫ

•

Светлай памяці маёй маці Соф'і Данілаўны Збароўскай, ураджэнкі в. Ліхаўня Нараўлянскага раёна, прысвячаю.

На згоне дваццатага веку,
Распяты на атамнай дыбе,
Хачу аднае асалоды:
Прыйсці-дабрысці да Славечны
І, рукі ў пясок ўвагнаўшы,
Напіцца вады цудадзейнай.
І стану я п'яны ад гэтай
Вады мутнаватай палескай,
Салодкай і горкай спрадвеку.
І стану я шчасным без меры
Ад тых успамінаў бясхмарных,
Якія падарыць Славечна.
А з тых успамінаў, як з зораў,
Згадаю я самы-найсамы:
То Ліхаўня, вёсачка з вёсак,
Што ціхаю вулкай-крывулкай
Збягае ў абдымкі Славечны,
Ўсплывае з глыбіняў Славечны...

I

Упала нейтронная манна на плечы
Усім ліхавенцам у ТОЙ красавік.
Той манны не змесці,
той манны не лечаць —
І край мой палескі зжурыўся, панік.

Дзе чыстыя воды, дзе чыстае поле?
Дзе чыстыя стрэхі, дзе чысты пясок?
Чарнобыльскі вецер шугае на волі,
Чарнобыльскі попел стаў цвёрды,
як ток.

Куды вы плывеце, няшчасныя рыбы? —
Далей ад чарнобыльскіх злых каміноў.
Чаму не заглядваюць промні праз шыбы
У хаты? — Навошта: няма жыхароў.

У чорных мундзірах, як колісь эсэсы,
Пачвары-нейтроны жыццю б'юць пад дых.
На водах, у полі, у хатах, у лесе
Гвалтуюць усіх — ад старых да малых.

II

У год выбуховы душа маёй цёткі
Туды адляцела, дзе ціш і спакой.
Радня ля труны парадзела таропка,
Чакаючы вынасу цела. Царой

Сам Стронцый нахабна ішоў к дамавіне,
Да цётчыных рук, нібы ліс, прыпадаў,
Калі ж мы вясковай плылі каляінай,
На дзядзькавым ганку пан Цэзій стаяў.

За клубам пакурваў паважна Плутоній
(У Ліхаўні зараз я н ы на кані).
У атамным прыску на могілках тоне
Труна з маёй цёткай. Куды ні зірні —

Радню пад крыжамі замшэлымі бачу,
А вось — папаўненне з нейтронных франтоў.
Над Ліхаўняй плачу, над цёткаю плачу...
І дзядзька ў магілу т ы м годам сышоў.

III

І Ліхаўня атамнай стала Хатынню
Пакінулі вёску яе жыхары.
І хаты здзічэлі пад атамнай стынню,
А потым бульдозер прыйшоў на зары.

Ён шчыра капаў перад кожнаю хатай
Глыбозную яму, глыбейшай не знаў,
А потым бязлітаснай белай лапатай,
Заехаўшы з тылу, жытло заганяў

У вечную яму, на вечныя сховы
І хлеў, і калодзеж з старым жураўлём,
І плот, і альтанку. І масай сталёвай
У яме прыплюшчыў драўляны ўвесь лом.

У ямах-магілах закрылі павекі
Пад горбікам жоўтай жвірастай зямлі
Ўсе мары людзей, што жылі тут спрадвеку,
Але ж ім спакойна дажыць не далі.

IV

Дзе Рыцева хата пад дахам бляшаным?
Дзе Нолеў дамок, што ля студні стаяў?
Дзе Левана дом сярод грушак ціхмяных?
Дзе домік Вітоля, што ў пчолах танаў?

Дзе Ветравай дом, маёй цёткі гаротнай?
Дзе Эдзі Збароўскага, брата мне, дом?
Стаяў ён ля клуба зусім не самотна
І быў упрыгожаны бэзу кустом.

Дзе Броні Равуцкай утульны дамочак?
Я столькі разоў смачна ў ім гасцяваў.
Дзе Шверына домік, як весні званочак,
Што ля Ліхавенкі-малечы стаяў?

Дзе домік Яструэмскіх? Дзе хатка Альфоны?
Няма! Захаваны яны на вякі.
Дзірван на магілах пануе зялёны.
На вулцы былой раскашуюць дзікі.

V

Хто Ліхаўню верне? Хто верне Гамарню?
Няма Данілелеўкі, Карпавіч — тож.
У Дворышчы — пустка.
Над вёскамі хмарна.
Над вёскамі-склепамі — атамны дождж.

Хто Ліхаўню верне: яе вечаровасць
І дрогкасць світання і спёку паўдня?
Яе заімглёнасць у дождж вераснёвы
І гулкасць яе маразовага дня?

Хто верне мне Ліхаўні першыя зоры?
Хто верне апошнюю вёскі зару?
Хто мне ліхавенскія верне прасторы
Без чаду нейтронаў? — Я вам гавару

Усім, што бяздумна ЧАЭС будавалі,
Хто з атамам дзікія жарты вялі.
Бязлюдзелі вёскі ці ў землю прапалі —
А людзі упрочкі па свету пайшлі.

VI

Па ўсёй Беларусі цяпер ліхавенцы,
У "брудных" і "чыстых" раёнах жытло,
Найменне гаротнае — перасяленцы —
Ім сэрцы і душы наскрозь прапякло.

Ім там, я упэўнены, Ліхаўня сніцца:
Славечны разлівы, буслы на грудах,
Чаргоўка у полі, грыбы ля лясніцтва,
І цёплыя ветры гукаюць у шлях,

У шлях, у дарогу да мілых аселіц
Да родных магіл, незабытных лагоў,
Да цёплых і ў сцюжную пору мяцеліц,
Да скусаных рэчкаю губ-берагоў.

Улегчы за плугам, прайсціся з касою,
Да сёмага поту узводзіць стагі.
Ды не! Бо там Цэзій нячутнай хадою
З сябрамі даўно сцеражэ мурагі.

VII

Траюрадны брат Эдуард, што ля клуба
У доме пад бэзавай замеццю рос,
Задоўга-задоўга да атамнай згубы
Хацеў, каб у Ліхаўні жыў і Хрыстос,

Каб ён з вышыні свае цёплыя рукі
Над кожнай хацінай, былінкай прасцёр,
Каб роспач, адчай, і трывогі, і мукі
Заўжды абыходзілі кожнага двор.

Ён марыў пра помнік салдатам Айчыннай,
Што з Ліхаўні выйшлі у мужны дазор,
А зараз наспела другая прычына:
Узвесці у Ліхаўні помнік да зор.

На ім напісаць прабачэнне салдатам,
Што мы у спакойныя быццам гады
Прыкрыць не змаглі, перасяліўшы атам,
Ні жыццяў, ні вёсак, ні чыстай вады.

VIII

Мне Ліхаўня сніцца: то з дзядзькам на возе
Прывезлі духмянае сена, як чай,
То цётка з гасцінцам стаіць на парозе:
"Пляменнічак, дома майго не мінай".

То з Ветравым-братам на Карпавай яме
Спрабуем на блешні узяць шчупакоў.
То Эдзік склікае у клуб вечарамі
На лекцыю стомленых днём землякоў.

Ці сніцца, як поклічы ў лесе лунаюць —
То "Све-то!", то "Ва-лё!",
то "То-лё!" ляціць:
Да атамнай эры грыбы сабіраюць,
Ім рэха паслухаць шчымліва карціць.

То бусел спрабуе з буслянкі узняцца,
Але бусляняты баяцца — і ў крык...
Ды толькі не здолеў у сны мне прабрацца
За дзесяць гадоў ЧОРНЫ ТОЙ красавік.

На згоне дваццатага веку,
Распяты на атамнай дыбе,
Я бачу: ў наступным стагоддзі
Злавесныя знікнуць нукліды
І сотні нашчадкаў з Славечны
У Ліхаўню ўранку прыедуць,
І возьмуць мужчыны сякеры,
Каб новую Ліхаўню ставіць.
Вось ладныя зрубы бялеюць
І трэсачкі дзеці збіраюць.
А потым гуртом на Славечну,
Да Карпавай, Немцавай ямаў,
Ідуць, каб зрабіць абмыванне
У водах, што панцыр нуклідны
Занеслі ў далёкія далі.
І будуць здаровыя рыбы
З шчаслівымі дзецьмі купацца,
І яблыкаў, груш неатрутных
Кашамі ў дамы пананосяць,
І бэз зацвіце не нуклідны
Ля кожнай шчаслівае хаты.
І будзе вялікае свята:
Сябры з Мазыра і Нароўлі
Свае прывязуць віншаванні
І тосты падымуць да неба,
І стрэнуцца тосты ля зораў
З самотай маіх ліхавенцаў,
Якія пакінулі вёску
На згоне дваццатага веку.

Пошта

ЧАС ВЫСТАЎЛЯЦЬ РАХУНАК

26 красавіка 1986 года падзяліла развіццё суверэннай Беларусі на дзве часткі: да чарнобыльскай катастрофы і пасля. Гэта катастрофа паўплывала і будзе ўплываць і надалей на ўсе сферы міждзяржаўных адносін ва ўсім сусветным супольніцтве. Вось чаму ААН напярэдадні трагічнага дзесяцігоддзя аварыі прапанавала аб'явіць 1996 год Міжнародным годам Чарнобыля. У нас, дзе сам генафонд нацыі пастаўлены на грань знікнення і самазнішчэння, гэта ініцыятыва ААН павінна быць шырока падтрымана дзяржаўнымі, грамадскімі арганізацыямі, дзеячамі навукі і культуры. Гэта тычыцца і іншых краін, якія пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы.

Асноўны цяжар наступстваў атамнай катастрофы лёг на плечы беларускага народа. Спачатку рабіліся спробы аблегчыць гэтыя наступствы намаганнямі Беларусі, Расіі, Украіны і ўсяго былога СССР. У выніку распаду СССР і ўтварэння незалежных суверэнных дзяржаў Рэспубліка Беларусь засталася сам-насам са сваёй бядой. Расія, як першапрыемніца абавязацельстваў па СССР, ухілілася ад дапамогі Беларусі ў пераадоленні вынікаў Чарнобыля. Больш за тое, сваёй пратэкцыянісцкай палітыкай у галіне энерганосьбітаў Расія павялічвае эканамічны крызіс у Рэспубліцы Беларусь. Падобным чынам паводзіць сябе і Украіна, занятая ўласнымі праблемамі ўмацавання незалежнасці і суверэнітэту. Хоць яшчэ ў кастрычніку 1989 года Вярхоўны Савет Беларусі прыняў праграму пераадолення вынікаў чарнобыльскай аварыі і звярнуўся да ўрадаў Расійскай Федэрацыі і Украіны ўзяць на сябе частку фінансавых расходаў у гэтай справе.

Беларусь, паўтараю, змагаецца з бядою адна. Нядаўна калегіі Кабінета Міністраў рэспублікі быў прапанаваны новы праект дзяржаўнай чарнобыльскай праграмы на перыяд да 2000 года, створана новае міністэрства па надзвычайных сітуацыях, закліканае вырашыць пытанні пераадолення вынікаў Чарнобыля, выратавання беларускай нацыі. Мер гэтых зусім недастаткова. Увесь комплекс глабальных мер па змяншэнні наступстваў трагедыі можна вырашыць толькі з дапамогай сусветнай супольнасці, і ў першую чаргу нашых суседзяў — Расіі і Украіны.

Па дадзеных анколагаў, да 2000 года кожны другі жыхар Беларусі будзе хворы на анказахворванні. Асабліва прагрэсіруе рак шчытападобнай залозы ў дзяцей. Ужо сёння шмат дзяцей у Беларусі гіне. Сярод нованароджаных — амаль 10 працэнтаў дзяцей з разумовымі і псіхічнымі адхіленнямі. Калі гэта лічба дасягне 14 працэнтаў, як сцвярджае балгарскі прафесар Дзенеў, народ асуджаны на выміранне. Менавіта Чарнобыль спрыяе таму, што працягласць жыцця беларусаў скарачаецца, а смяротнасць расце.

Паводле падлікаў спецыялістаў Міжнароднага інстытута менеджменту, генеральным дырэктарам якога з'яўляецца дэпутат Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь В. Цярэшчанка, доўг Расійскай Федэрацыі народу Рэспублікі Беларусь за матэрыяльныя выдаткі ў сувязі з чарнобыльскай катастрофай складае 35 мільярдаў долараў. Паводле норм міжнароднага права, на працягу 10 гадоў адны краіны могуць прад'явіць юрыдычныя і матэрыяльныя прэтэнзіі да другіх. Пасля 26 красавіка 1996 года Рэспубліка Беларусь ужо не зможа прад'явіць іск да Расіі праз міжнародныя арганізацыі. Канвенцыю 1963 года аб адказнасці за ядзерныя страты дагэтуль не ратыфікавалі ні Расія, ні Украіна, ні Беларусь. Па-ранейшаму Беларусь прадаўжае плесціся за сваім "старэйшым братам" у хвасце яго палітыкі, што наносіць велізарныя страты нацыянальным інтарэсам Рэспублікі Беларусь. А між тым Беларусь мае права не прасіць, а патрабаваць выплаты гэтага доўгу. Наадварот! Расія рэгулярна патрабуе велізарных сум за энерганосьбіты, а ўрад Беларусі рэгулярна выплачвае гэтыя сумы цаной далейшага зніжэння жыццёвага ўзроўню сваіх жыхароў. Такой неразумнай эканамічнай палітыкай урад Рэспублікі Беларусь давёў уласны народ да поўнай галечы. Неабходна тэрмінова ўзбудзіць справу аб выплаце Расійскай Федэрацыяй фінансавай кампенсацыі Беларусі ў памерах і тэрмінах, прадугледжаных у свой час пастановай Савета Міністраў СССР. Адмаўленне ад пастаноўкі такога пытання парламентам Рэспублікі Беларусь хрысціянскія дэмакраты разглядаюць як здраду нацыянальным інтарэсам Беларусі.

Новаму Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь неабходна:

1) Аб'явіць праз ААН Рэспубліку Беларусь зонай нацыянальнага бедства.

2) Праз ААН звярнуцца да ўсіх урадаў свету выратаваць генетычны фонд беларускай нацыі праз свабодную эміграцыю і стварэнне пасяленняў у іншых краінах з чыстай безрадыяцыйнай экалогіяй.

3) Звярнуцца з іскам да ўрада Расійскай Федэрацыі як правапрымальніцы былога СССР, роўна і да Украіны, узяць на сябе значныя выдаткі па ліквідацыі наступстваў Чарнобыля.

4) Пры ААН арганізаваць Міжнародны фонд дапамогі Чарнобылю (па тыпу яўрэйскага "Сахнут") па бясплатным перасяленні беларусаў у іншыя краіны, па ўласным выбары, з грашовай дапамогай на ўладкаванне.

5) Звярнуцца па дапамогу ў міжнародныя арганізацыі САЗ, МАГАТЭ, ЮНЕСКА. Гуманітарная дапамога расцягваецца камерцыйнымі мафіёзнымі структурамі, псуецца, гніе, губляецца і не даходзіць да простага чалавека, жыхара Рэспублікі Беларусь.

6) Прад'явіць праз Міжнародны суд у Гаазе іск на суму 35 мільярдаў долараў да ўрада Расійскай Федэрацыі як правапрымальніцы СССР за матэрыяльны ўрон у сувязі з чарнобыльскай катастрофай.

7) Звярнуцца да ўрада Украіны з патрабаваннем павялічыць асігнаванні на ліквідацыю наступстваў чарнобыльскай аварыі.

Міхаіл ВАШКЕВІЧ

г. Мінск

"ДОБРА ТРЫМАЦЦА ЗА ТВАЮ РУКУ"

РЫЧАРДУ СМОЛЬСКАМУ — ПЯЦЬДЗЕСЯТ ГАДОЎ

Не сумуй, дружа Рычард Баляслававіч, хоць пяцьдзесят гадоў гэта даўно не дваццаць пяць, але яшчэ і не семдзесят. Успомні, як трыццаць два гады таму пасля выпускнога вечара ў шляхетным чорным касцюмчыку ты ехаў у сталіцу, у тэатральны інстытут. Ехаў з добра знаёмай кожнаму правінцыялу мэтаю: паступіць абавязкова, асесці ў сталіцы і праславіцца. Ты, артыст мастацкай самадзейнасці, быў знаёмы толькі сваім землякам з Ліды. Мінула ўсяго толькі якіх-небудзь трыццаць гадоў і мары студэнта спраўдзіліся. Вывучыўся, стаў доктарам мастацтвазнаўства, асеў у сталіцы (о, з якой цяжкасцю будаваў ты сваю кааператыўную кватэру), жонка ахоўвае твой хатні лад, а дачка і сын надаюць аптымізму.

Неяк неўпрыкмет як бы прыйшла і слава пад рукі з аўтарытэтам. Часам дзіўлюся, гэта ж колькі напісана табою рэцэнзій на кнігі, спектаклі, фільмы, колькі было творчых камандзіровак у абласныя тэатры, у народныя калектывы, колькі разоў ты браў удзел у з'ездах, пленумах, семінарах, фестывалях, аглядах вучоных саветаў, секцый крытыкі!

Колькі артыстаў, чыя праца знікае разам са спектаклем, удзячны табе за тое, што ты іх увекавечыў на старонках сваіх кніг і рэцэнзій. Не сумняваюся, што Гасподзь сказаў бы: "усё гэта хораша, бо прыйшло да цябе прызнанне, дружа, заслужана, набыта працай і талентам". Не сумуй, брат мой па пяры, у час, калі светам кіруюць толькі грошы, ты ствараеш летапіс тэатра, высвятляючы асобныя вехі як прыклад высокага мастацтва нашага народа (не надта можа і тэатральнага). Ніхто з тэатральных дзеячаў не скажа, што ты злосны крытык, высакамерны чалавек, з'едлівы цынік. Твая крытыка заўсёды тонкая, мудрая, але прынцыповая. Ты даказаў, што ўзровень тэатральнай рэцэнзіі ані як не залежыць ад узроўню спектакля.

Ты не зласліў ад прыроды і да кожнага творцы ставішся з вялікай павагай, разумеючы, што калі нават атрымаўся і пасрэдны спектакль, стваральнікі яго тварылі ўсе адно. Ты ніколі не скіраваны на разбурэнне творчай асобы, яе стылю, светапогляду, на разбурэнне тэатра і яго накірунку. Ты сапраўдны доктар тэатра, бо ведаеш усе яго хваробы і прапануеш рэцэпты. Можа, гэта ад таго, што ты і сам паспытаў хлеба сцэнарыста і драматурга. Ты ніколі не адмаўляеш творам у пошуку, эксперыменце. Але ж цябе, рэаліста — народніка, які глыбока вывучыў душу беларуса (сам ты з каталікоў, як вядома, але ўсе твае сябры — праваслаўныя), ніхто не перацягне на бок прыхільніка часовага, суперавангарднага, нежывога.

Твой творчы прынцып — адданасць ідэі тэатра як кафедры, які сваімі сродкамі ратуе душы, прасвятляе, сцвярджае дабро і надае сілы чалавеку жыць далей. І гэта скажа Гасподзь: "хораша".

Не сумуй, калега! Мы ж колісь пісалі разам п'есы ў гасцініцы на здымках фільма. Ты прачытаў маю і сказаў, што яна лепшая за тваю, і параіў пісаць далей, прывёў у тэатральны інстытут. Твая апантанасць тэатрам — для астатніх прыклад. Багата хто вучыўся ў Няфёда У. І., дашкрабаліся да кандыдатаў многія, але ж доктарам за апошнія пятнаццаць гадоў стаў адзін Смольскі! Цяпер ты маеш сваіх вучняў. У час адраджэння капіталізму тэатр з кафедры ператварыўся ў шоу, збяднелі душой людзі вельмі хутка. Ты падтрымліваеш мяне і астатніх думкаю, што гэта часова. Працуеш, як і раней. Не толькі за пісьмовым сталом. Ты ўласнымі рукамі збудаваў невялічкую дачу, успамінаю, як садзілі смародзіну, яблыні, вішні. Як жа часта ты "лётаў" на выхадныя ў сваю Ліду, саромеючыся прызнацца сябрам, што там хворы бацька, які ляжыць нерухома шмат гадоў. Неяк і я пазнаёміўся з ім. Дагэтуль памятаю ягоныя словы: "Ёсць людзі, якія палезуць на касцёл, каб счысціць з крышы снег, а ёсць тыя, хто лезе, каб скінуць крыж". Як добра, Рычард Баляслававіч, што ты ніколі не расчараваў бацьку і кіраваўся ўчынкамі першай катэгорыі людзей.

І гэта кажа Гасподзь: "добра".

Не сумуй, калега. Ты знаходзішся ў зеніце творчых мажлівасцей і яшчэ маеш сілы, каб іх рэалізаваць.

Сумуй аб адным. На жаль, не змогуць пасядзець на тваім юбілеі бацька, твае два дзяды, дзве бабулі. Гэта ж колькі перамалоў час жыццяў тваіх далёкіх продкаў сялянаў, гараджан, рамеснікаў, вояў, купцоў, пакуль не праславіў іх усе дзесяць кален першы доктар мастацтвазнаўства. Ганарыся, горад Ліда. А ты, сябра, яшчэ й сумуй аб тым шчаслівым часе, які ніколі не вернецца, але які заўсёды з табой, аб часе, калі ты ехаў школьнікам на агляд мастацкай самадзейнасці ў сталіцу першы раз, высунуўшы з акна аўтобуса руку насустрач ветру, сонцу і людзям...

Я ехаў такім жа чынам з Давыд-Гарадка... Мне, ды і не толькі мне аднаму, добра трымацца за тваю руку, сябра. Надзейна. І скажа Гасподзь, што й гэта "добра".

Георгій МАРЧУК

З ЧАГО ТЭАТР ПАЧЫНАЕЦЦА?

ДВА СПЕКТАКЛІ ПАД ДАХАМ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ ТВОРЧАЙ МАЙСТЭРНІ-ЛАБАРАТОРЫІ МАЛЫХ ТЭАТРАЛЬНЫХ ФОРМ

Вялікі тэатральны рэфарматар пакінуў нам свой варыянт адказу на сакраментальнае пытанне "з чаго пачынаецца тэатр?" і, здаецца, ён многіх задаволіў. Натуральна, куды ж прыстойнаму чалавеку, які купіў білеты і прыйшоў у тэатр, прыладзіць жончына футра і свой капялюш?.. Праўда, у наш час "пераходнага перыяду" (у якім свой рэй вядзе крымінальны свет) не ўсе рызыкуюць карыстацца тэатральнай вешалкай, мяркуючы, што ў руках, на каленях — неяк больш надзейна. Тым не менш, пытанне — з чаго пачынаецца тэатр? — застаецца надзённым для многіх рупліўцаў сцэны, а колішні адказ Станіслаўскага ўспрымаецца не больш як дасціпны жарт задаволенага пана Аляксеева, які ў свой час атрымаў ад бацькі ў спадчыну прыбытковую маскоўскую фабрыку і меў магчымасць бестурботна займацца любімай справай. На вялікі жаль, сённяшнія беларускія прэтэндэнты ў тэатральныя рэфарматары такой спадчыны не маюць. Бацькі пакінулі ім нешта іншае. Ва ўсякім разе, праблема вешалкі не здаецца ім галоўнай у працэсе стварэння тэатра.

Дык, сапраўды, з чаго пачынаецца тэатр?

На мой погляд, чалавецтва ўжо даўно знайшло адказ на пытанні такога плана. Праўда, хто першы сфармуляваў адказ, ніхто не ведае, а вось апошняга аўтара славутай тэзы "Кадры вырашаюць усё!" ведаюць многія, асабліва людзі сталага веку. І тым не менш з сапраўдных прафесійнікаў пачынаюцца многія справы на нашай грэшнай зямлі. Такі прыклад з тэатральнага жыцця на Беларусі. Не ведаю, калі і дзе ў галаву дырэктара Маладзёжнага тэатра Віргініі Тарнаўскайтэ (яна, дарэчы, не толькі адмысловы тэатральны кіраўнік, але яшчэ і рэжысёр, драматург, грамадскі дзеяч) прыйшла адна ідэя, ды, зрэшты, не гэта галоўнае. Важна іншае: В. Тарнаўскайтэ, па маіх назіраннях, належыць да той вельмі рэдкай катэгорыі тэатральных людзей, якія валодаюць сакрэтам пераўтварэння сваіх ідэй і праектаў у рэальныя справы. Убачыўшы, што ў апошнія гады тэатральна-грамадскае жыццё на Беларусі неяк згасае ("элітная" рэжысура ўжо доўгі час "выразна" маўчыць, або забаўляецца дзіцячымі эксперыментамі ў так званы "аўтарскі тэатр", а маладым творцам, асабліва тым, хто жыве і працуе ў правінцыі, няма магчымасцей заявіць аб сваіх амбіцыях), Віргінія Тарнаўскайтэ задумала і с т в а р ы л а (тут ёй актыўна дапамагло Міністэрства культуры) на базе свайго тэатра Рэспубліканскую творчую майстэрню-лабараторыю малых тэатральных форм. Мэта гэтай майстэрні, калі гаварыць сцісла, — дапамагаць драматургам, рэжысёрам, акцёрам і іншым прафесійнікам сцэнічнага мастацтва ў рэалізацыі сваіх праектаў, папулярызацыі дзейнасці таленавітай тэатральнай моладзі, што працуе ў правінцыі. Адным словам, Рэспубліканская творчая майстэрня-лабараторыя малых тэатральных форм, — гэта тое месца, куды абласныя і гарадскія тэатры нашай краіны могуць прывезці свае спектаклі, паказаць іх сталічнай тэатральнай грамадскасці, абмеркаваць з калегамі і крытыкамі вынікі сваіх пошукаў і эксперыментаў.

Спектаклі не жывуць доўга (відэазапісы справы пасутнасці не мяняюць!), адсюль — аб'ектыўная неабходнасць у публічных абмеркаваннях, у правядзенні розных сустрэч і дыскусій тэатральных творцаў. (У гэтай сувязі невялікая рэмарка ў дужках: Беларускі Саюз тэатральных дзеячаў па розных прычынах — аб'ектыўных і суб'ектыўных — адышоў ад такой патрэбнай справы, захапіўшыся, відаць, іншай "рэвалюцыйнай" ідэяй — ператварыць паўсядзённае цяжкае жыццё майстроў сцэны ў бесперапынны вясёлы фэст... У нейкай ступені, як ні дзіўна, гэта ўдалося: асобныя тэатральныя "генералы" ледзь паспяваюць з цягніка на цягнік у вандроўках па фестывалях. Ну а "шарагоўцы" сцэны, асабліва ў абласных тэатрах, здабываюць свой кавалак чорнага хлеба ў штодзённай працы: толькі мараць хоць на нейкае імгненне вырвацца з "катла", у якім варацца гады і дзесяцігоддзі. Уяўляеце, які "навар" у тым тэатральным "катле"...).

У такіх варунках праект В. Тарнаўскайтэ, згадзіцеся, уяўляецца вельмі своечасовым і патрэбным. Цяпер справа за канкрэтнымі крокамі. І яны — зроблены. Менавіта яны — першыя крокі ў вырашэнні пастаўленых задач — і прымусілі мяне ўзяцца за пяро і падзяліцца з чытачамі ўражаннямі ад спектакляў, што ўжо прайшлі на падмостках Рэспубліканскай творчай майстэрні-лабараторыі малых тэатральных форм.

Адкрыццё Майстэрні адбылося 4 снежня 1995 (дакладны дзень занатоўваю для будучых культуролагаў і гісторыкаў беларускага тэатра). У той дзень свой спектакль "Чорт у рабрыну" М. Манохіна паказаў Гомельскі абласны драматычны тэатр. Праз месяц, у студзені 1996 г., быў паказаны спектакль "Вераб'іная ноч" паводле твораў У. Караткевіча Беларускага акадэмічнага тэатра імя Я. Коласа. У лютым і сакавіку гасцямі Майстэрні

З МАЛАДЗЕЧНА — У СТАЛІЦУ

Сімфанічны аркестр г. Маладзечна ў Мінску выступаў не ўпершыню. Аднак гэты канцэрт, які адбыўся 16 красавіка, быў асаблівы. Прысвячаўся ён 10-годдзю чарнобыльскай трагедыі. А праходзіў у Дзяржаўным тэатры музычнай камедыі Беларусі, стаўшы своеасаблівай справаздачай маладзечанскіх музыкантаў перад сталічнымі гледачамі і — вынікам дружбы, плённага супрацоўніцтва двух маэстра: мастацкага кіраўніка гэтага аркестра Рыгора Сарокі ды галоўнага дырыжора тэатра музкамедыі Аляксандра Сасноўскага. Пад іхнім кіраўніцтвам у той вечар прагучалі творы П. Чайкоўскага, Ш. Гуно, Д. Расіні, А. Дворжака, Д. Шастаковіча, І. Кальмана, У. Солтана, В. Іванова... У канцэрце бралі ўдзел вядомыя салісты Валеры Кучынскі, Уладзімір Пятроў, Людміла Станевіч, а таксама студэнт Акадэміі музыкі Канстанцін Красніцкі. На дзён колькі раней гэткі ж супольны канцэрт з вялікім поспехам прайшоў у Маладзечне, стаўшыся значнай падзеяй культурнага жыцця горада.

Л. Р.

У СВЯТЛЕ "ПРАЛЕСКІ"

Першы абласны фестываль дзіцячых клубаў па месцы жыхарства з паэтычнай назвай "Пралеска" прайшоў у Віцебску. Яго ўдзельнікі правялі выставу дзіцячых работ, паглядзелі спектакль у выкананні ўзорнага тэатра абласнога аб'яднання па пазашкольнай рабоце "Мара", прынялі ўдзел у творчых праграмах.

Пераможцам фестывалю стаў дзіцячы клуб "Крыніца" ЖЭУ N 26.

На здымках: выступаюць члены дзіцячага клуба "Крыніца"; выстава дзіцячых работ; на фестывалі.

Фота Аляксандра ХІТРОВА, БЕЛТА

ПІСАЎ НА МОВЕ ІДЫШ

Сярод пісьменнікаў, што загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, і Рува Рэйзін, якога не стала ў 1942 годзе. На жаль, дакладна невядома і дата яго нараджэння. А з'явіўся Р. Рэйзін на свет у 1911 годзе ў Лондане, у сям'і рабочага, які выехаў у Англію на заробкі. Рана застаўшыся сіратой, Р. Рэйзін выхоўваўся ў дзіцячым доме ў Слуцку. У 18-гадовым узросце прыехаў у Мінск, працаваў мулярам, паступіў на рабфак. У 1937 годзе скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, у 1940-ым быў прызваны ў армію.

З першымі вершамі Р. Рэйзін выступіў у 1929 годзе. Пісаў на мове ідыш. Выдаў кнігу "Вершы і апавяданні" (1929), зборнікі паэзіі "Нялёгкай працай" (1934), "Вершы" (1940). У 1935 годзе асобным выданнем выйшла паэма "Вялікая хартыя".

Асобныя творы Р. Рэйзіна, перакладзеныя на беларускую мову, змешчаны ў зборніку "Мы іх не забудзем" (1949).

будуць калектывы з Мазыра (тэатр імя І. Мележа) і Бабруйска (тэатр імя В. Дуніна-Марцінкевіча). Як бачым, у арганізацыйным плане справа пайшла даволі добра. У творчым жа плане, мастацкім — вынікі не такія ўжо адназначныя.

Не магу не заўважыць адну цікавую дэталь: крытыка часцей станоўча ацэньвае творчыя намаганні таго ці іншага мастака, чым ягоныя калегі. Чаго тут больш — прынцыповасці або звычайнай прафесійнай рэўнасці — сказаць цяжка. Адзначу толькі, што празмерная рэўнасць, як даўно ўжо паказаў Шэкспір сваім Атэла, да дабра не даводзіць. Адным словам, пачуццё меры — далёка не апошняя справа ў жыцці і творчасці.

У правамернасці гэтай старажытный і заўсёды актуальнай тэзы пераконвае і спектакль Гомельскага тэатра "Чорт у рабрыну", пастаўлены мастацкім кіраўніком трупы Уладзімірам Караткевічам. Прычым, гэта немудрагелістая на першы погляд мараль наконт пачуцця меры тычыцца як самога зместу спектакля, так і сродкаў тэатральнай выразнасці — многае тут трымаецца на вельмі рызыкоўнай мяжы паміж добрым мастацкім густам і адкрытай пошласцю. Усё вырашаюць нюансы, адценні, паўтоны ў сцэнічным аповедзе пра амаль анекдатычную гісторыю кахання старога вясковага дзеда і маладзенькай яшчэ дзяўчыны. Але чаму, уласна кажучы, анекдатычную? Тут я міжволі злавіў сябе на думцы, што мае асабістыя псіхалагічныя і этычныя ўяўленні аб такіх рэчах неяк перашкаджаюць з поўным даверам успрымаць менавіта гэту гісторыю кахання, што прапанавалі драматург М. Манохін і рэжысёр У. Караткевіч. Хоць прафесійны досвед крытыка падказвае і нібыта суцяшае: нічога новага і дзіўнага аўтары спектакля "Чорт у рабрыну" нам не прапаноўваюць, у сусветнай драматургіі такіх сюжэтаў шмат, а некаторыя з іх сталі сапраўднай класікай. Напрыклад, студэнты ўсіх тэатральных інстытутаў былога СССР вывучалі гісторыю спектакля "Перад заходам сонца" Г. Гаўптмана ў Ленінградскім акадэмічным тэатры імя А. С. Пушкіна з Мікалаем Сіманавым у галоўнай ролі. Славуты акцёр, адзін з апошніх вялікіх магікан рамантычнага стылю ў рускім сцэнічным мастацтве, іграў Мацыяса Клаўзена чалавекам выключнага кшталту і моцных пачуццяў...

А тут?.. Застаўся дзед удаўцом, жыў ціха, даглядаў гаспадарку, грошы збіраў, нават труну прызапасіў, адным словам, быў чалавекам звычайным і прагматычным. І раптам — чорт у рабро: закахаўся ў маладую і прыгожую кватарантку. Аднак самае дзіўнае наперадзе — прыгажуня адказала... узаемнасцю і пачалося: пад урачыстыя салютныя стрэлы паляўнічае стрэльбы сталі... нараджацца дзеці!..

П'еса М. Манохіна, напісаная ў жанры камедыі, належыць да ліку тых твораў драматургіі, якія, просценькія вонкава і нават прывабныя (дынамічны сюжэт, трапны і дасціпны дыялог), утойваюць для тэатра рэальную небяспеку апусціцца да пошлага і банальнага сцэнічнага пераказу анекдатычнай гісторыі менавіта пра "гэта". (Хаця і многія класічныя п'есы таксама можна "апусціць" ніжэй, прабачце, пупа і па такія прыклады не трэба далёка ехаць).

У такіх выпадках многае залежыць ад прафесійнай узброенасці рэжысёра, акцёраў, іх пачуцця густу і меры. Хоць, відаць, я дарэмна вылучаю менавіта гэтыя якасці — пачуцці густу і меры. Іх наяўнасць ёсць адно са сведчанняў сапраўднай прафесійнасці. (Праўда, практыка заўсёды значна багацейшая за тэорыю. Напрыклад, як ставіцца да спектакляў накшталт "Вольнага шлюбу" у Рускім акадэмічным тэатры імя М. Горкага, у якім, з аднаго боку, даволі шмат арыгінальных рэжысёрскіх і акцёрскіх прыёмаў, а з другога — вельмі мала таго, што называецца добрым мастацкім густам, бо ніхто мяне не пераканае ў "глыбокай змястоўнасці" і "чароўнай эстэтычнасці" дэманстрацыі аголеных мужчынскіх азадкаў на акадэмічнай (!) сцэне. У мяне такое ўражанне, што некаторыя рэжысёры занадта літаральна зразумелі заклікі да тэатральных рэформ. Тэатр не варта пераўтвараць у рэстаран, як не варта перабудоўваць яго і ў царкву. Кожнаму — сваё! Тэатру — тэатрава.)

Лепшыя спектаклі У. Караткевіча, якія мне прыйшлося бачыць у розных тэатрах Беларусі, з поспехам выконвалі шматлікія функцыі, што "прадпісаны" тэатру самой прыродай сцэнічнага мастацтва.

Што да пастаноўкі "Чорта ў рабрыну", дык гэты камерны сцэнічны аповед не прэтэндуе зрабіцца значным творчым дасягненнем вопытнага рэжысёра, які больш схільны да маштабных спектакляў. Хоць майстар ёсць майстар: забаўляльная і неверагодна-казачная гісторыя набыла ў спектаклі, вырашаным у жанры лірычнай камедыі (у праграмцы жанр пазначаны з пэўным камерцыйным націскам — "камедыя для дарослых"), адметныя рысы жыццёвай верагоднасці. У рэжысуры няма імкнення да самамэтнай відовішчнасці і гранічнай умоўнасці, максімальнага выкарыстання музычных, пластычных і іншых прыёмаў, што сведчыла пра давер У. Караткевіча да драматургічнага матэрыялу п'есы. Мізансцэны даволі простыя і натуральныя ў той сцэнічнай прасторы, што прапанаваў мастак Г. Чубукоў — падрабязны інтэр'ер вясковай хаты з выхадам на падворак. Побытавы прынцып сцэнаграфіі прадыктаваў і адлаведны спосаб акцёрскага існавання, у якім пераважалі прыёмы псіхалагічнай школы выканання. Гомельская трупа гэтымі прыёмамі заўсёды валодае добра. Адсюль — цудоўны акцёрскі дуэт Аляксея Бычкова (Дзед) і Наталі Дзяберынай (Шурка). Прызначэнне А. Бычкова на ролю Дзеда (па ўзросце акцёр значна маладзейшы за свайго зухаватага героя) надало спектаклю якраз тую ступень жыццёвай верагоднасці, праз якую сцэнічны аповед зрабіўся асабліва шчырым ды праўдзівым. Нечаканы паварот у спектаклі, жанр якога, на мой погляд, хутчэй нагадвае калядную казку з традыцыйным "хэпі эндам". Хоць назва спектакля і ўтрымлівае слова "чорт", — яго энергетыка вельмі цёплая і стваральная. Відаць, адна з галоўных прычын такога плённага выніку, — у душэўнай цеплыні і шчодрасці аўтараў і ўдзельнікаў пастаноўкі.

Збольшага традыцыйны спектакль "Чорт у рабрыну" не толькі забаўляе, але і выклікае шмат пачуццяў, думак, асацыяцый, нарэшце, ён прымушае самых уражлівых гледачоў адчуць, зразумець што ёсць на зямлі простыя і адначасова вялікія чалавечыя каштоўнасці, уладарыць якімі здольны кожны, ці, дакладней, амаль кожны з нас...

Казка? Вядома, казка, але ёсць у ёй і свая пэўная праўда, якая абнадзейвае і цешыць. У кантэксце нашага часу, сённяшняй дыскамфортнай рэчаіснасці з яе рынкавымі "скразнякамі" такі вынік творчых намаганняў драматурга, рэжысёра, акцёраў, згадзіцеся, шмат чаго варты.

Адсюль узнікла ў мяне і першае ўдакладненне да адказу на пытанне, што вынесена ў назву артыкула. Можа, тэатр пачынаецца менавіта з дабрыні?.. Сёння звычайную людскую спагадлівасць і дабрыню можна ўжо заносіць у Чырвоную Кнігу страчаных маральных каштоўнасцей. Міжволі падумалася: ці не таму ў нас цяпер так мала сапраўдных тэатраў...

Невялікі сцэнічны абразок паводле твораў класіка сучаснай беларускай літаратуры У. Караткевіча, у прыватнасці, пралога да рамана "Нельга забыць" і некаторых вершаў, паказаў Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа. У Віцебску пастаноўка ідзе на Эксперыментальнай сцэне. Яе стваральнікі і ўдзельнікі — маладыя коласаўскія акцёры: Міхась Краснабаеў (аўтар інсцэніроўкі, рэжысёр і выканаўца ролі), Валянцін Салаўёў, Алена Шарэпчанка, Генадзь Гайдук, Юрась Цвірка. Мастак — Галіна Сідарава, музычнае афармленне Алеся Крыштафовіча. Знарок пералічваю ўсіх — як той казаў, тэатральная Беларусь павінна ведаць сваіх герояў. Пішу гэта без усялякай іроніі. Задума ў стваральнікаў спектакля была адмысловая і складаная — прабіцца да сучаснага гледача, яго душы, сэрца, розуму са сваімі грамадзянскімі і патрыятычнымі пачуццямі, сваімі трывогамі і болямі за лёс роднай Бацькаўшчыны, яе будучыні. Адсюль і пэўны сімвал у назве пастаноўкі — "Вераб'іная ноч", якая, паводле народных паданняў, прыпадае на сярэдзіну жніўня, калі ідзе змаганне паміж цёмнымі і светлымі сіламі. У праграмцы спектакля яго аўтары адразу вызначаюць сваю пазіцыю і перакананасць: "Праз усю гэтую ноч бушуе жахлівая навальніца, і толькі пад раніцу светлыя сілы перамагаюць..."

Што ж, перакананасць — рыса неабходная ў любых справах: прыватных, дзяржаўных, творчых. А калі яшчэ ёсць і талент, вопыт, прафесійнасць — тады рыхтуй, дзяржава, медалі сваім героям. На мой погляд, наша маладая і небагатая дзяржава можа пакуль ашчадзіць медалі. А вось арганізатарам будучых "Маладзечанскіх сакавіц" (гэта тэатральны фестываль беларускіх "зорак") трэба ўжо сур'ёзна думаць пра ўзнагароды для маладых коласаўцаў, якія выявілі ў "Вераб'інай ночы" не толькі свае амбіцыі (рыса таксама неабходная ў творчасці), але і некаторую "амуніцыю". Так, напрыклад, акцёр В. Салаўёў у ролі капітана Пора-Леановіча паказаў сябе ўпэўненым прафесійнікам, здольным вырашаць складаныя творчыя задачы. Стрыманая, нават аскетычная манера ігры не перашкаджае акцёру данесці да гледача моцныя і супярэчлівыя пачуцці свайго героя, яго апантанасць і гарачую любоў да радзімы. Тут я хачу падкрэсліць адну важную дэталь: герой В. Салаўёва зусім не той традыцыйны рэзанёр, якіх мы шмат бачылі на сцэнах нашых тэатраў, а перш за ўсё неардынарная асоба, душа якой нясцерпна баліць за свой знявечаны народ, яго цяжкі лёс.

Удала іграе таксама і Алена Шарэпчанка ў ролі жонкі Усяслава Грынкевіча, на долю якой выпалі надзвычай цяжкія выпрабаванні — ёй не ўдалося выратаваць свайго мужа ад пагібелі. Актрыса ўзнімаецца на значную вышыню перажывання — эмацыйнага і інтэлектуальнага. Непадзельнасць думак і пачуццяў — адметная рыса ў яе выкананні.

Я не схільны перабольшваць каштоўнасць і значэнне гэтай эксперыментальнай пастаноўкі (ёй адчувальна бракуе арыгінальнай драматургічнай асновы і дакладнага рэжысёрскага вырашэння, у якім пераважае эклектыка), але, тым не менш, нельга не бачыць таго станоўчага, адмысловага і перспектыўнага, што ёсць у рабоце. Перш за ўсё хацелася б падтрымаць той грамадзянскі настрой маладых коласаўцаў, які, відаць, і падштурхнуў іх да стварэння сцэнічнага твора з адметным патрыятычным гучаннем. Бо, на вялікі жаль, менавіта гэтыя асноватворныя духоўныя імператывы свядомага людскага жыцця — патрыятызм і грамадзянская годнасць — у апошнія гады прыкметна здрабнелі ў вачах многіх нашых суайчыннікаў.

Магчыма, я крыху захапіўся эмоцыямі і патэтыкай, але, бачыць Бог, пішуцца гэтыя радкі пад уплывам спектакля "Вераб'іная ноч", — спектакля далёкага ад дасканаласці па форме, але вельмі шчырага і сумленнага па сутнасці, па танальнасці ў размове пра адвечнае...

Тэатру — тэатрава. Дык усё ж такі, з чаго пачынаецца ён?..

Рычард СМОЛЬСКІ

На здымку: А. Бычкоў (Дзед) і Н. Дзяберына (Шурка) у спектаклі "Чорт у рабрыну".

Фота А. БЕЛАВУСАВА

"ТРОЙЧЫ З ЗЯМЛІ СЫХОДЗІМ..."

(Працяг. Пачатак на стар. 9)

●

Яна стройная. І спадніцы, кофты, джэмперы — дабрэнныя. І ў ватоўцы нічога сабе. Яна была выселена сюды. Тушонкі прывезла багата і так многа чаго. Кажуць, што яна Хведара палюбоўніца. І работаюць разам на ферме. Хай іх Бог рассудзіць! У людзей вочы завідушчыя, рукі — заграбушчыя. Блудніца грэх творыць, а ў каторай чалавека няма, Бог прабачыць. А ў яе ж і няма мужыка. Усё самой трэба, беднай. І з вёскі сваёй выехала, радня — па свеце.

●

Які першы дзень посту — такое будзе лета, прымхі такія. Серадпосце — палавіна посту: туды і сюды. Як серадпосце, учынялі хлеб, здымалі вяршок — і пяклі хрэсцікі. Іх на поле бралі, як сеялі, валам давалі.

І мы цяпер, нібыта тое серадпосце: самі тут, а душа наша там, дзе жылі да Чарнобыля.

●

Хадзіце, будзем пышкі есці са смятанай. Выпійце. Бабе на слёзы не застаўляйце. І так іх многа сышло, цэлае возера, мабыць, як пакідала і хату, і агарод, і людзей, і ўсё, што нажыла — ручнікі, вышыванне... Да што й казаць! Галька, ідзі да нас. У мяне гулянікі дома. Што баба мае, тым і прымае. Тут перажыў дзень — і слава Богу!

●

Прывезла адтуль расліну — бульбай завецца, зімуе, не мерзне. Як сапраўдная бульба. Высокая толькі. Адзін сахаркай балеў, я яму дала, піў гэта, лягчэй стала.

●

О, гэта рай, хто свой куточак мае. Свой кусцік — нанач пусціць. А я цяпер як сваха пераезная: у адной пляменніцы пажыву, да другой еду. Што дадуць, тое і добра. Бачу, што замінаю ім, — далей еду. Такая мая жытка стала. А раней усё дома корпалася ў градах, у калгас хадзіла, у лес. Дый што казаць, не цанілі мы таго, што мелі. Добра там, дзе нас няма. Ды адно дрэўца перасадзі, яно прымецца, зазелянее, а другое — зачахне. Ці то зямліца другая, ці паветра не тое? Ці цеплыні не хапае?

●

Не ўсе роўныя людзі. Перасялілі, сышліся мы, сёстры, — будзем разам жыць. Але потым сталі сваркі. Сястра ўсё за грашыма прападала. Дзяцей не мела, жальбы не мела. Як высялялі нас адтуль, людзі галосяць, а ёй хоць бы што. Чужога дабра не судзі, а свайго паганага не хвалі. Дапякала яна мяне. Я ўсё плачам ды плачам адбывала, сыходзіла на бурты, каб не было свары. Нельга так зрабіць, каб другому свой характар уставіць. Мяне людзі, не яна, даглядалі, як была я хворая, малако прыносілі. І я падзельчывая. Кожнаму спачуваю. Кепскага нічога не раблю. Па-боску жыву. "Не хадзі да яе", — кажуць. А я хаджу. Крэўная яна ўсё-такі. У мяне такое сэрца.

●

Як перасялілі, спярша жыла я ў п'яніцы. Яна доіць кароў — ды зап'е. Нічога ў губу няма ўзяць. Дзіця галоднае. Я вазьму, што-небудзь дам яму. Усё там вымыла, вышкрабла. А яна ў шафе маёй пакрала. Выцягвала проста рукамі мяса з каструлі. Прама адвярнула мяне ад яе. Пагаравала, а з кім пагаворыш, нікога тут роднага, знаёмага добрага няма.

●

Мёд суседка прынесла. А там у нас свая сям'я пчол была. Пчолы ў борці жылі, а борць — у лесе. На дрэва лазілі, мёд даставалі. Кілаграмаў пяць мёду набіралі. Як грэчка цвіце, каліна, ліпа, акацыя, канюшына, лубін, — пчолы лясныя туды ляцяць.

Каторы мёд на верасе — цёмны, інакшы на смак. Па вясне — светла-жоўты. Які там цяпер мёд: на колер і на пах? Ці вядуцца пчолы?

●

Адна я тут у брыгадзе з перасяленцаў. Раблю на ферме. Пяць хлявоў адкідай гною. Задыхаюся, упаду на гной. За дзень вымахаюся. Чалавек мой паўнаваты. У яго чорныя лёгкія. Але цяпер і цюкі разгружае, і салому. У мяне дзвесьце пяцьдзесят выхадаў на работу. Пяцьдзесят сотак буракоў вазьму — і зраблю Пяцьдзесят чатыры тоны буракоў здала. Падабрала некалькі гектараў ільну. Праскуранцы баяцца радыяцыі.

●

Былі ў Чарнобылі. Як саравалася — у горле клуб, дыхання не было. Мы там летавалі, душыліся ды чавіліся. Я лета барабаніла, зерне ачышчала. Мы буракі, бульбу пасеялі, парасло. Яшчэ і здавалі гарбузы і буракі на склад. А потым са склада грузілі, склад вычышчалі. У баню ганялі — радыяцыю змываць. У канцы кастрычніка нас прывезлі ў Праскурні. Прывезлі на пакуты. Накідваліся на нас: нашто мы сюды прывалакліся. Гіркалі, як на сабак. Тут такое месца, што дроў няма. Беражом, па паленцы расходуем. Нейкая зваляка ёсць тут. Назбірае чалавек адзін ды прадасць дравец. Кожны год да сябе ездзім. Павыбівалі вокны ўсе чысценька. Багата там пазасталося: стол, ложак, кажух, сячкарня. Не далі рады дацягнуць. Чарнобыль — такая бяда, такая навала!

●

Глянь, дзеці на вуліцы скачуць, прыгаворваюць: "Дожджык, дожджык, перастань, я паеду на Іардань..." Ты ведаеш, дзе тая Іардань? Не хачу я туды. А ў вёску сваю б паехала. Там магіла маёй маці — Пелагеі. Залатыя рукі ў яе былі. Вось гэтыя карункі, вышыванкі — усё яе. Я берагу іх, нават сюды прывезла.

Яна ўсё ўмела ў мяне: і прасці, і ткаць, і вышываць, і спяваць хораша. Як бацьку забралі, перастала спяваць. Толькі аднойчы пачула, як яна ціхенька заспявала: "Не стой, Юр'я, над вадой, горка вада пад табой". А ў самой слёзы, бы бабіны, коцяцца. І я заплакала. Горкая доля ёй выпала. Я часта хадзіла на яе магілу: то пазамятаю, то вяргіню пасаджу. А цяпер усё там пазарастала, у рост чалавека вымахала. А можа, дзікія звяры яе магілку разрылі? Не здолею туды паехаць, адгрэбсці чорнае лісце з яе магілы. Чорны Чарнобыль усе сокі з мяне павыпіў. Ледзь соўгаюся.

●

Мы тут усе перасяленкі. Збяромся, пяём: "Ехаў казак долам. Дзеўка — даліною. Расцвіў казак ружай. Дзеўка — каліною". Нас запісалі на пласцінку. Начальнік нейкі да нас прыязджаў, а з ім тыя, хто запісваў. Ён кажа: "Цераз тры гады будзеце пець па тэлевізары". Ганка пакрыўдзілася: "За гэты час мы можам і памерці. Мы ж — чарнобыльцы".

●

Мяне другі раз сурочылі: "Ох ты, баба, і жывеш: тры каровы, хата, як хароміна!" І на табе — пыхнуў Чарнобыль і нічога не засталося.

Ад злых вачэй урок заўсёды. Я яшчэ тады дзяўчынкай была. Хадзіла прама, танклявая, косы ледзь не да падлогі целяпаюцца. Адзін мужык сказаў: "Якія дзеўкі павыраслі, з месца не сысці".

Прыйшла, пасядзела ў людзей, нядобра стала, у гарачку кінула, рве. Бабку паклікалі. Вечарам адпусціла. Мужчынскі ўрок цяжэйшы.

Калектыў рэдакцыі часопіса "Полымя" смуткуе з выпадку смерці былога тэхнічнага рэдактара ЗАХАРАВАЙ Марыі Міхайлаўны і выказвае глыбокае спачуванне яе сям'і, родным і блізкім.

Саюз беларускіх пісьменнікаў выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Міколу ДУБОЎСКАМУ з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці маці.

Рэдакцыя часопіса маладых літаратараў Беларусі "Першацвет" выказвае глыбокае спачуванне свайму супрацоўніку пісьменніку Міколу ДУБОЎСКАМУ ў сувязі з вялікім горам — смерці маці.

Калектыў часопіса "Тэатральная творчасць" выказвае глыбокае спачуванне члену рэдкалегіі МАМОНЬКУ Уладзіміру Адамавічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю маці Клаўдзіі Апанасаўны.

У нядаўняй публікацыі ("Звязда", 1996, NN 4—5) паэт Леанід Дранько-Майсюк абмежаваў час нараджэння твораў паэзіі сарака гадамі чалавечага ўзросту. Кожны мае права меркаваць пра ўсё, што хоча, і так, як яму здаецца — гэтак, прынамсі, сцвярджае Асноўны Закон дзяржавы. Аднак хачу і сам выкарыстаць гэта права.

ЧАС НАРАДЖЭННЯ ПАЭЗІІ

Не з тае прычыны, што перабраў, перавысіў вызначаны тэрмін болей як у два разы, і ўсё яшчэ, гады ў рады, вытыкаюся ў друк і хачу абараніць сваё права на гэта. А што рабіць, калі ўначы прахватваешся: узбудзіла сугучча, падступіла пад горла і вымагае: ці спявай, ці ператварай у словы. Абгонішся так-сяк, ідзі, маўляў, прэч, не перабівай сну. А яно, гэтае сугучча — назола, не знікае і раніцай, вядзе пад душ, п'е разам гарбату, замінае слухаць апошнія навіны. Пакуль не пасадзіць за стол і не загадае руцэ — запісвай!

Разважыўшы, астыўшы, выбіраеш з напісанага за паўгода ранішніх прыхваткаў адзін-два вершыкі — рэшта ў кош. А насланнё з'яўляецца кожнае начы. А дні цяпер — кожны без выключэння — поўныя з коптурам: падзеямі, на жаль, найбольш цяжкімі, з крывёю, весткамі — найчасцей непрыемнымі, сустрэчамі — пераважна няўцешнымі.

Усё гэта ўзбуджае, падымае ў стан духоўнага напружання, узнёсласці, віднаты, калі здаецца, усё можаш дастаць рукою, сказаць словам, прыхінуць душою. Думаю, стан гэты зазнавалі ўсе паэты і ведаюць, чаму ён названы натхненнем: стаіць над дыханнем, над тхненнем, вышэй звычайных магчымасцяў дыхаць і ўспрымаць. Да кожнага чалавека яно прыходзіць і адыходзіць па-свойму, — я расказаў пра маё. Дадам: ніводнага радка з запісаных паводле ўласнага памкнення, а не прадыктаваных часам, абставінамі, людзьмі, я не перанёс на паперу без папярэдняга ўладнага і таемнага ўзнікнення сугучча-мелодыі, а ў ім заўсёды таілася, чакаючы выяўлення, думка.

Загаловак згаданай звяздоўскай публікацыі "Як гэта недарэчна — калі паэту больш за 40" мог бы з добрай усмешкай прачытацца як запеўка іранічнага верша. Аднак загаловак падмацоўваецца не сказаць каб трапнымі доказамі.

Так, не дабылі да сарака Пушкін і Лермантаў, а іх імёны трэба вымаўляць стоячы. За імі можна вымавіць — Блок і Ясенін, знойдзецца не адно светлае імя і сярод тых, што і да трыццаці не падняліся. А хто дасць заруку, перайдзі гэтыя постаці ўмоўны рубеж "саракоўкі", дык ці не стаў бы на каленкі перад імі свет. Многія глыбіні і вышыні адкрыліся б, яшчэ больш дазналіся б насельнікі зямлі пра сябе, нарэшце, яшчэ болей бы вырасла паэтаў у Паэты, а людзей у Людзі. А Маякоўскі? Можна запярэчыць: надмерна скрычаўшыся, успамянуў, што быў "красивый, двадцатидвухлетний" і паклаў сам сябе, трыццацісямігадовага, сваёй рукою ў труну. Так, ён наступаў "на горло собственной песне", крычаў, хацеў падзяліць цяжкі шлях народа, вызваліць ад бруду і друзу, што пагражаў яго, Маякоўскага, ідэалу будучыні, у імя якой змалку рынуўся ў рэвалюцыю паэт. Але, напэўна, і яму было б што сказаць пасля сарака, калі ў прадсмяротныя дні і гадзіны вырываліся лірычныя "молнии телеграмм", і "Млечпуть серебрянной Окою", і абяцанне, пабачыўшы, "какая в мире тишь", гаварыць "векам, истории и мирозданью".

Дык ці не зарызыкоўны будзе такі закід звяздоўскай публікацыі: "Да 40 гадоў паэты (калі яны Паэты) пішуць лепшыя свае творы. Далей ужо пачынаецца не спеў, а крык" (будучы ў сіле, да сарака, можна было б і ўтрымаць руку ад какафоніі).

Крык душы вырываецца ў зусім маладых паэтаў: "І кожны, хто мяне спытае, пачуе толькі адзін крык", — агаласіў Янка Купала, узыходзячы на паэтычную дарогу. І стаў верш-крык неўміручым, бо вуснамі Купалы крычаў з вялікага болю і крыўды народ.

Хто ж яны, залічаныя ў крыкуны? Можа, чаго добрага, Ларыса Геніюш? Яна ж добрых пяцьдзесят год, з-за мяжы, з-за лагерных крат, з зэльвенскае самоты словам паэзіі выкрывала боль роднай зямлі, сваю любоў да яе, гнеў і пратэст супраць прыгнёту і паняволення Маці.

Хто ж, нарэшце, яны, што асмеліліся, пераступіўшы фатальныя сорак, пісаць горкую праўду? Танк, Пысін, Вялюгін, Панчанка? Давайце глянем у іхнія публікацыі часу 60—70-х гадоў, перагорнем перадсмяротную падборку Танка ў "Полымі". Дзе той крык, пабойцеся Бога! Чытач адчуе там натхнёнае і паэтычнае слова, зазнае ўзрушэнне-ўздым. А час абавязкова пазначыць многа якія вершы самай высокай пробай.

На жаль, даваенны шасцітомны збор твораў і кнігі Янкі Купалы 20—30-х гадоў не былі даступныя нават даследчыцкаму воку, тым больш чытачу.

Адна з забароненых цалкам кніг Янкі Купалы — 1918—1928", прысвечана аўтарам "памяці тых, што памерлі ў змаганні за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне маёй бацькаўшчыны". У злавесным 1930, калі пачалося звышзацятае выкарчоўванне так званай нацдэмаўшчыны, кніга пасля надрукавання трапіла за шафы ў выдавецкім калідоры. Не ў магазін жа было пускаць! Сама назва паказвае на дзесятыя ўгодкі (25.III.18) абвяшчэнне БНР. Удзельнікі і стваральнікі гэтай падзеі правакуюцца і дапытваюцца: кніга "1918—1928" — бунт і пратэст. Яна больш за 60 гадоў вандруе са мною і зараз паказвае творы паэта мала даступныя і недаступныя зусім. Вылучым з іх напісаныя Янкам Купалам на пятым дзесятку. Разгорнем кнігу:

"Ёсць жа яшчэ..." (1926 г.):

Ёсць жа яшчэ
ў мяне песень,
Поўных надзеі, жыцця, —
Як бы ні быў ім свет цесен,
Вырвуцца ў свет з небыцця.

Цудоўнае "Мне сняцца сны аб Беларусі" сказана ў 1924 г., далей, "Калісь мы ў Рыгу збожжа везлі, Цяпер зямлі завезлі часць" — у 1926, "Зерне ўкінулі шчасліва, чыстае, як вока" — з тых жа дат.

Нават з паасобных радкоў чытач даўно пачуў: гаворыць Паэт.

Нагадаю асобныя цыклы, з якіх хацелася б выпісваць і выпісваць: "З угодкавых настрояў", дзе праз бравурнасць чуецца сарказм, "Безназоўнае" з яго ёмістым падтэкстам, "Маладая ачуняла" і "І што я зрабіў ёй такое", потым "І прыдзе", "На пагранічны"...

Даволі! Возьме гэтыя творы чытач і пераканаецца, наколькі тактоўна вінаваціць у крыку Янку Купалу і "любых іншых".

Пра настроі Янкі Купалы, пра абставіны, у якіх ён жыў, пра тое, што прымаў і чаго не прымаў ён у тагачассі, сведчыць наступнае. Тыраж кнігі "1918—1928" трапіў не адразу пад нож. Спачатку падняў на сябе руку аўтар яе, не так страшачыся зняволення, як хочучы выгукнуць пратэст, дапамагчы без віны звінавачаным.

Як ставіўся да навязанага для напісання яму сам паэт? Янка Купала, ужо з ордэнамі, значкамі дэпутата і лаўрэата, казаў: "Не хачу, не магу жыць, не буду. Больш за ўсё лаю сябе за тое, што застагнаў тады, і адратавалі мяне". Гэтыя словы чуты неаднойчы мною і запісаны, але паводле розных умоў не агалошаны.

А хіба ў нас не на памяці Аляксандр Твардоўскі, паэт светлай і горкай праўды і праз тое — вялікі. Пасля сарака і да апошніх дзён сваіх нёс ён гэту праўду — аў ёй горыч і крыўду. Дык ці не пакінем праз гэта мы плакаць і ўсміхацца над кнігамі "Стихи из записной книжки" (1961), "Из лирики этих лет" (1959-67), "За далью даль" (1950-1960), над пасмяротнымі публікацыямі.

Калі нехта скажа, нібы сляза і ўсмешка не лепшыя крытэрыі для вызначэння сапраўднай паэзіі, рашуча запярэчу словамі Пушкіна: "над вымыслом слезами обольюсь", гэта над тым, чаго не было, але праз паэта стала праўдай аж да плачу.

Адступім крыху ў мінулае. І адразу ж: доўгажыхар паэзіі Афанасій Фет. "Вечерние огни" былі створаны чалавекам з ношкай гадоў пад семдзесят і за семдзесят. Яго ж любіў і паважаў сам найвялікшы Леў, а гэтага мудраца на вершаванай мякіне было не падмануць.

Нарэшце, "Фауст", тварэнне, да якога толькі можа ўзняцца чалавечы дух. А Гётэ пісаў трагедыю і парадкаваў яе ў другой палавіне свайго доўгага веку.

Аўтар звяздоўскай публікацыі Леанід Дранько-Майсюк мае запас трываласці — два гады да сарака — і надзейныя сродкі падняць настрой: гімнастыка і чытанне Тургенева.

Так, Тургенеў вялікі пісьменнік і вялікі рускі чалавек. І паэт вялікі. Аляксандр Блок напісаў "Седое утро" і назваў так кнігу, узяўшы эфіграф "Утро туманное, утро седое" з тургенеўскага верша "В дороге". Што ж, няхай беларускі паэт чытае на здароўіца Тургенева, жыве ў тургенеўскім свеце смелых і сарамлівых жанчын, апантаных людзей маладога і сярэдняга веку, здольных рынуцца на барыкаду. Напэўна, ён звярнуў увагу, што паміж тымі жаночымі вобразамі ёсць "...чыстая і засяроджаныя, яны наўздзіў падобныя да статуяў". І гэта Сафі, Сусана і Клара Міліч. Так прыкмеціў выдатны пранікальнік у глыбіні класікі Інакенці Аненскі ў сваёй славутай "Книге отражений".

Знойдуцца ў Тургенева і вальяжныя дамы і стомленыя жыццём старыя кавалеры...

Тургенеў неаднойчы сцвярджаў сваю імпэтнасць да работы: "Мне 64 года, пожил в свое удовольствие, а теперь надо и честь знать. И работать теперь могу". (Ліст да Л. Б. Бертэльсона 22.XII.1882).

На гэтым можна было б развітацца, каб не апошні абзац звяздоўскай публікацыі: "Чамусьці з'явілася ўпэўненасць, што паэтычны спеў не залежыць ад узроставай мяжы. Ці я памыляюся?" Фактычна гэтыя словы Дранько-Майсюка касуюць усё сказанае папярэдне (калі яны не належаць інтэрв'юеру) і тлумачацца проста.

Маладосці ўласціва нагаворваць на сябе лішняга: пажаліцца на цяжар гадоў, на зашмат перажытых нягод, крыху паздавацца зморaным, мудрым, зазнаўшым кайданы адзіноты і тугі.

Што ж, гэта хутка мінае.

Максім ЛУЖАНІН

Марцін КОЎЗКІ

ДОЛЯ ПРАЎДЫ

Здзейснілася светлая мара Маркса: краіна ўся як адзін калгас — і працуем самааддана амаль бясплатна, і свае ж, калгасныя, пасвяць нас.

●

"Проста ў лоб, — папракнулі байкапісца, — пішы пра недахопы ў філасофскім плане, скажам, мядзведзь таптун, дурныя бараны, чытай: кіраўнік не вучыць падначаленых". — "Ну я ж і кажу без лішніх слоў: мядзведзь дурны, бо і ён з бараноў".

●

— Хто ў вас тут крайні? — спытаўся мужык каржакаваты. — Лепш гаварыць "апошні", — паправіў каржакаватага акулярык. — А мне ўсё адно — апошні, першы, загадана прывесці крайняга, вінаватага, так што збірайся ты, інтэлігентны... Самкнулася чарга, абурана загаманіла, але што ты зробіш з грубай сілай?

●

За шчасцем не магу вачыма шнарыць, яно ў нас як пад напарсткам шарык. "Ты не за шарыкам, за шулерам сачы", — казалі на вакзале гледачы.

●

Унучачка сочыць, як друкую на машынцы, цікавяць малую ручкі і рычагі. Можа, і я спасцігаючы ісціну, бачу пакуль што толькі ручкі і рычагі. Ад гэтай думкі павольней бягуць радкі, і ўсё-ткі запаўняецца аркуш паперы, бо ёсць у нязведанага берагі, я ў гэта веру, у відма веру!

●

Папулярная тэлевізійная перадача "Усмак". Казачная імпартная пліта, падобная на вярстак. Прывазныя далікатэсы — шафран, шампіньёны, крэветкі, парады славутых, як гатаваць "сама так"... І хмурыя пенсіянеркі, што атарапела сядзяць перад "скрынкамі" і заўтра прагаласуюць за партыю "Антысмак".

●

Ці ёсць жыццё на іншых планетах? Калі ёсць спрыяльныя ўмовы ў Сусвеце. Спрыяльныя ўмовы? А як жа беларусы, звезеныя ў тайгу і паселеныя пад прымусам? Выжылі на мізэрных сотках землякі і ў нялёгкія пасляваенныя гадкі. Беларусаў грамілі, давілі, душылі, а яны не прапалі, не змарнелі, не змыліліся. Ёсць жыццё ў міжпланетнай сістэме, калі туды трапіла беларускае семя!

●

Адвечны бой рэалій, адвечны бег на месцы: жаданне звузіць талію, імкненне нешта з'есці.

●

Удзельнікі семінара па тушэнні пажараў ехалі на машыне ў свой клуб. Раптам адчулі пах гару — гарэў у суседняй вёсцы зруб. Старшы, не вагаючыся, павярнуў аўтобус, каманда сама зляцела з губ. Патлумачылі тады, што спозніліся на вучобу, бо выратоўвалі зруб. Праўда была не такой фанфарнай — не на пажары затрымаліся пажарныя. У суседняй вёсцы адкрылася крама, а дарогі не заўсёды ідуць прама. Дык хіба ж, зважаючы на акалічнасць такую, чвэрць краіны не так рапартуе?

●

Балада пра манумент Купрыянавым. Кожны чацвёрты, кожны чацвёрты, а ў іх усім пяцярых... Ды зрабіўся адразу манумент Купрыянавым аб'ектам тонкіх інтрыг. Не трэба залішне нагадваць народу пра цану, заплачаную у вайну, і вырашылі захаваць на прыроду непажаданую даўніну. Пустуе ў Мінску плошча Мяснікяна, паслядоўнага бальшавіка, дзе мог бы стаяць манумент Купрыянавым, каб не схамянуўся ЦК.

ЛіМ ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ

Саюз беларускіх пісьменнікаў; Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь; калектыў рэдакцыі газеты "Літаратура і мастацтва"

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 ГОДА

Газету рэдагавалі:

Х. Дунец	(1932-35)
І. Гурскі	(1935-41)
А. Куляшоў	(1945-46)
М. Горцаў	(1947-49)
П. Кавалёў	(1949-50)
В. Вітка	(1951-57)
М. Ткачоў	(1957-59)
Я. Шарахоўскі	(1959-61)
Н. Пашкевіч	(1961-69)
Л. Прокша	(1969-72)
Х. Жычка	(1972-76)
А. Асіпенка	(1976-80)
А. Жук	(1980-86)
А. Вярцінскі	(1986-90)

Галоўны рэдактар Мікола ГІЛЬ

РЭДАКЦЫЙНАЯ РАДА:
Святлана БЕРАСЦЕНЬ, Міхась ЗАМСКІ, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Жана ЛАШКЕВІЧ, Алесь МАРЦІНОВІЧ, Барыс ПЯТРОВІЧ — *першы намеснік галоўнага рэдактара,* **Юрась СВІРКА, Віктар ШНІП** — *намеснік галоўнага рэдактара*

АДРАС РЭДАКЦЫІ:

220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19

ТЭЛЕФОНЫ:

прыёмная рэдакцыі — 332-461
намеснікі галоўнага рэдактара — 332-525, 331-985
аддзелы:
публіцыстыкі — 332-525
пісьмаў і грамадскай думкі — 331-985
літаратурнага жыцця — 332-462
крытыкі і бібліяграфіі — 331-985
паэзіі і прозы — 332-204
музыкі — 332-153
тэатра, кіно і тэлебачання — 332-153
выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў — 332-462
навін — 332-462
мастацкага афармлення — 332-204
фотакарэспандэнт — 332-462
бухгалтэрыя — 268-640

Пры перадруку просьба спасылацца на "ЛіМ".

Рукапісаў рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі і думкамі аўтараў публікацый.

Набор і вёрстка камп'ютэрнага цэнтра тыднёвіка "ЛіМ"

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах

Друкарня "Беларускі Дом друку" (г. Мінск, пр. Ф. Скарыны, 77)

Індэкс 63856. Наклад 7315.
Нумар падпісаны 25.4.1996 г.
Заказ 2087/Г

П 123456789 1112
М 123456789 1112